

Асаблівасці рэпетыцыйнага тэсціравання



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

СТАР. 2



Прышчэпка супраць раку

СТАР. 8


Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

# ЗВЯЗДА

14 САКАВІКА 2014 г. ПЯТНІЦА № 47 (27657) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## НОВЫЯ ВАРЫЯНТЫ КААПЕРАЦЫІ

**Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з кіраўніком Рэспублікі Мардовія Расійскай Федэрацыі Уладзімірам Волкавым. Беларускі кіраўнік прапанаваў Мардовіі прапрацаваць новыя варыянты кааперацыі для выпуску высокатэхналагічнага канкурэнтаздольнага беларуска-расійскага прадукту.**

«Трэба прапрацаваць новыя варыянты кааперацыі, задзейнічаўшы для гэтага не толькі наш вытворчы, але і навукова-тэхналагічны і кадравы патэнцыял для выпуску высокатэхналагічнага канкурэнтаздольнага беларуска-расійскага прадукту», — сказаў Прэзідэнт.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, развіццё ўсебаковага супрацоўніцтва з рэгіёнамі Расіі застаецца адным з важнейшых прыярытэтаў для Беларусі. «Нашы прамыя кантакты без перабольшання можна назваць асновай гандлёва-эканамічных сувязей дзвюх краін», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

На яго думку, эканомікі Беларусі і Мардовіі ў нечым падобныя і ў многім дапаўняюць адна адну. «Таму, лічу, не памылюся, назваўшы асноўнымі напрамкамі ўзаемадзеяння вытворчую кааперацыю, аграпрамысловы комплекс, будаўнічую, інавацыйную сферы», — сказаў Прэзідэнт. Разам з тым ён канстатаваў, што аб'ёмы ўзаемнага гандлю Беларусі з Мардовіяй у мінулым годзе знізіліся ў параўнанні з 2012 годам больш чым у два разы і склалі каля $50 млн. А ў дакрызісным 2008 годзе гэты паказчык складаў прыкладна $170 млн. Аляксандр Лукашэнка перакананы, што неабходна пераадолець негатыўныя тэндэнцыі і аднавіць узровень гандлёва-эканамічных адносін. «Гэта наша галоўная з вамі задача», — сказаў Прэзідэнт.

Беларусь гатова забяспечваць мардоўскіх партнёраў шырокім спектрам аўтамабільнай, дарожна-будаўнічай, сельскагаспадарчай, пасажырскай, камунальнай тэхнікі, у тым ліку з выкарыстаннем узаемапрымальных фінансавых інструментаў і ў рамках вытворчай кааперацыі.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Мардовія, як і Беларусь, мае развітую прамысловасць, а гэта добрая база для развіцця кааперацыі. «Пры прапрацоўцы новых варыянтаў кааперацыі, дзе плануецца задзейнічаць навукова-тэхналагічны і кадравы патэнцыял, трэба пашыраць супрацоўніцтва ВНУ і навукова-даследчых арганізацый», — сказаў Прэзідэнт.

Як вядома, у маі 2014 года ў Мінску пройдзе чэмпіянат свету па хакеі, а Мардовія рыхтуецца да арганізацыі матчаў чэмпіянату свету па футболе ў 2018 годзе, які пройдзе ў Расіі. Як лічыць Аляксандр Лукашэнка, мардоўскі бок можа выкарыстоўваць вопыт беларускіх будаўнікоў. Акрамя таго, у Беларусі вырабляюць будматэрыялы, ліфтавае абсталяванне і гатовы забяспечыць патрэбнасці мардоўскіх будаўнікоў.

Аляксандр Лукашэнка таксама закрануў тэму развіцця сувязей у гуманітарнай сферы. «Вы нам не чужыя людзі — нас трывала звязвае агульная культура і гісторыя», — сказаў кіраўнік дзяржавы. На яго думку, шмат аб чым сведчыць той факт, што юбілейнымі медалямі «70 гадоў вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў» будуць узнагароджаны больш за 120 жыхароў Мардовіі, якія прымалі ўдзел у баявых дзеяннях і вызваленні Беларусі.

Прэзідэнт падкрэсліў, што на перагаворах беларускі бок гатовы максімальна аператыўна разгледзець усе прапановы і выйсці на канкрэтныя дамоўленасці ў мэтах пашырэння ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з Мардовіяй.

**Паводле матэрыялаў БЕЛТА.**

## Млечны шлях праз Ліпаўку



**Імя жыхара вёскі Ліпаўка Касцюковіцкага раёна Аляксандра Запекіна на працягу многіх гадоў запар трывала трымаецца ў ліку пераможцаў Магілёўшчыны па вытворчасці і здачы малака дзяржаве. На падвор'і гэтага апантанага жывёлавода ўтрымліваецца 28 дойных рагуль, ад якіх у зімовы час за суткі атрымлівае па 330 літраў малака.**

— Цяжкай працы ніколі не баяўся і лёгкіх шляхоў ў жыцці не шукаў, — кажа Аляксандр. — Сельская гаспадарка — гэта мая стыхія, хоць яна і патрабуе шмат высілкаў, умення і клопату.

Толькі за мінулы год малаказборшчык Запекін здаў дзяржаве 105 тон сырадою, а яшчэ выгадаваў і здаў у мясцовую гаспадарку 32 цяляці.

Гэта не сакрэт, што надоі залежаць ад кармоў і племяннай работы. А таксама ўменне правільна падаіць карову. За свае старанні Аляксандр атрымаў ад «Бабулінага гладыша» даільны апарат, але па-ранейшаму частку свайго статку доіць уручную. Ёсць у Аляксандра і памочнікі — дзве дачкі. Нават малодшая — 12-гадовая Яўгенія — дапамагае бацьку і цялят дагледзець, і малако прафільтраваць.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Марыяна ШЧОТКІНА, міністр працы і сацыяльнай абароны**

***«Кіраўнікі прадпрыемстваў павінны несці персанальную адказнасць за нявыплату заработнай платы. Калі чалавек становіцца кіраўніком прадпрыемства, ён бярэ на сябе адказнасць за працоўны калектыў. І яго непасрэдны абавязак як наймальніка — своечасова выплачваць заработную плату або за кошт уласных рэсурсаў прадпрыемства, або за кошт крэдытаў. Гэта канкрэтная адказнасць канкрэтнага чалавека. Калі будзем за нявыплаты накладаць адміністрацыйныя спагнанні і штрафы на прадпрыемства, то грошы будуць ісці з агульнай кішэні. Трэба ўлічваць, што заработная плата складае 64,5% даходаў насельніцтва і грошы кожнаму працаўніку патрэбны своечасова для аплаты асноўных расходаў».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.03.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9810,00 | ■ |
| Еўра | 13680,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 269,00 | ■ |
| Укр. грыўня | 1049,20 | ▼ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +12° |
| Віцебск | +9° |
| Гомель | +13° |
| Гродна | +11° |
| Магілёў | +10° |
| Мінск | +11° |

■ Стала вядома

## МАЛАДЫМ РАБОТНІКАМ — БОЛЬШЫЯ ВЫПЛАТЫ ПА БАЛЬНІЧНЫХ

**Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч падтрымаў пазіцыю Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі адносна карэкціроўкі сітуацыі, у якой аказаліся работнікі, што адпрацавалі менш за паўгода да наступлення часовай непрацаздольнасці, паведамляе прэс-служба Федэрацыі прафсаюзаў.**

Паводле слоў старшыні арганізацыі Леаніда Козіка, прынятыя раней рашэнні аб змяншэнні памеру дапамог па цяжарнасці і родах, асабліва для жанчын, страхавыя ўзносы за якіх выплачваліся менш чым за 6 месяцаў і якія вылічваліся, зыходзячы з мінімальнага памеру, ідуць у разрэз з дзяржаўнай дэмаграфічнай палітыкай па павелічэнні нараджальнасці. Цяпер жа ў пастанову №569, якая датычыцца аплаты бальнічных лістоў, будуць унесены змены. Маладыя работнікі змогуць атрымаць сродкі, якія дазволяць набыць неабходныя лекі, набор прадуктаў.



**Святлана БАРЫСЕНКА.**

■ Абітурыент-2014

## ПРАФЕСІЙНА-ПСІХАЛАГІЧНАЯ ГУТАРКА АДМЯНЯЕЦЦА?

**Рэгістравацца ці не рэгістравацца абітурыентам для праходжання прафесійна-псіхалагічнай гутаркі?**

Гэтае пытанне сёння цікавіць дастаткова вялікую колькасць абітурыентаў, якія планавалі паступаць у ВНУ на адну з 10 спецыяльнасцяў, дзе ў папярэднія гады абавязковай умовай было атрыманне рэкамендацыі для ўдзелу ў конкурсе ад спецыяльнай камісіі. Задачай членаў камісіі было ацаніць кругагляд, матывацыю абітурыентаў і ўсвядомленасць іх прафесійнага выбару.

Дзеля справядлівасці трэба сказаць, што ў апошнія гады адмаўлялі ў рэкамендацыі толькі адзінкам. Менавіта таму многія і не разумелі сэнсу гэтай вельмі працаёмкай і нятаннай працэдуры. І вось днямі, на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы, прысвечанай уступнай кампаніі, нарэшце прагучаў намер адмовіцца ад правядзення прафесійна-псіхалагічнай гутаркі.

Між іншым, рэгістрацыя на папярэдні прафадбор стартавала яшчэ 5 сакавіка і будзе доўжыцца да канца месяца. Да канца сакавіка плануюць прыняць і новую рэдакцыю Правілаў паступлення ў ВНУ. Але што рабіць абітурыентам сёння? Асабліва тым, каму трэба дабірацца да ВНУ з сельскай мясцовасці? Ехаць ці не ехаць у абласны цэнтр або сталіцу?

У Міністэрстве адукацыі адказаць на гэтае пытанне не змаглі. Праўда, і інфармацыя аб рэгістрацыі на прафесійна-псіхалагічную гутарку знікла з партала Міністэрства адукацыі. Можна было б параіць абітурыентам не спяшацца з рэгістрацыяй, але на сайтах ВНУ, вызначаных месцам правядзення гутаркі, абітурыентаў па-ранейшаму запрашаюць зарэгістравацца да 31 сакавіка. Таму застаецца спадзявацца, што ў галоўным адукацыйным ведамстве краіны ў бліжэйшы час усё ж такі расставяць кропкі над «і».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Надвор'е

## У БЛІЖЭЙШЫ ЧАС НАС АТАКУЮЦЬ ЦЫКЛОНЫ

**Сапраўдная атака цыклонаў чакае Беларусь у бліжэйшы час. Аб гэтым на прэс-канферэнцыі, прысвечанай паводкавай сітуацыі ў рэспубліцы і гатоўнасці органаў і падраздзяленняў МНС да ліквідацыі наступстваў веснавой паводкі, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Дзмітрый РАБАЎ, перадае БЕЛТА.**

Як адзначыў сіноптык, у апошнія дні сярэднясутачная тэмпература паветра была на 6-11 градусаў вышэйшая за норму. Такое надвор'е больш падобнае на красавіцкае. Такім цёплым пачатак сакавіка ў Беларусі бывае прыкладна раз у 20-30 гадоў, па захадзе рэспублікі — адзін раз у пяць гадоў.

«Аднак ужо ў гэтыя выхадныя нас чакаюць складаныя ўмовы надвор'я, — прадоўжыў ён. — Уладу над надвор'ем возьме атлантычны цыклон, і надвор'е кардынальна зменіцца». У суботу на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца ападкі (пакуль у выглядзе дажджу), вецер з парывамі да 15-22 метраў у секунду. Днём у суботу і ў ноч на нядзелю парывы ветру будуць дасягаць 25-28 метраў у секунду. У дадатак да гэтага пахаладае. У нядзелю на большай частцы тэрыторыі таксама чакаюцца ападкі (у асноўным у выглядзе снегу і мокрага снегу), чакаецца мяцеліца, на дарогах месцамі могуць узнікнуць снежныя заносы. Тэмпература паветра ўначы складзе 0 — мінус 5 градусаў, днём — ад мінус 1 па поўначы да плюс 5 градусаў па поўдні.

«Але на гэтым усё не скончыцца, — адзначыў Дзмітрый Рабаў. — У пачатку наступнага тыдня прыйдзе чарговы цыклон. Чакаюцца складаныя ўмовы надвор'я. На большай частцы тэрыторыі будзе вецер з парывамі да 15-20 метраў у секунду, месцамі — да 25 метраў у секунду. Ападкі будуць у асноўным у выглядзе снегу, мокрага снегу. Пра нейкія моцныя маразы пакуль гаварыць не даводзіцца — тэмпература паветра будзе блізкай да нулявой адзнакі: ноччу — слабаадмоўнай, днём — слабададатнай».

У сярэдзіне наступнага тыдня прыйдзе трэці цыклон, які таксама на большую частку тэрыторыі прынясе снег, мокры снег з парывістым ветрам.

Папярэдне, паводле слоў Дзмітрыя Рабава, надвор'е палепшыцца толькі на наступныя выхадныя. На большай частцы краіны спыняцца ападкі, тэмпература паветра зноў пачне паступова павышацца.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### КОЛЬКАСЦЬ АХВЯР ВЫБУХУ Ў НЬЮ-ЁРКУ ДАСЯГНУЛА 6 ЧАЛАВЕК



Яшчэ 74 чалавекі, паведамляе NBC, пацярпелі, прычым двое з іх (жанчына і дзіця) знаходзяцца ў крытычным стане. Некалькі чалавек лічацца прапаўшымі без вестак. Выбух адбыўся 12 сакавіка каля 9:30 раніцы па мясцовым часе ў раёне Усходні Гарлем. У выніку абрушыліся суседнія пяціпавярховыя жылыя будынкі. Паводле слоў улад, адзіным сігналам аб уцечцы газу быў званок мясцовай жыхаркі ў энергетычную кампанію Consolidated Edison Inc, якая абслугоўвае дом. Яна паведаміла пра пах газу за некалькі хвілін да выбуху.

### УЛАДЫ КРЫМА АДМОВІЛІСЯ АДДАВАЦЬ УКРАІНЕ «АРТЭК» І РАДОВІШЧЫ НАФТЫ




Улады Крыма заявілі аб намеры вывесці з падпарадкавання Украіны міжнародны дзіцячы лагер «Артэк». З адпаведнай заявай выступіў спікер парламента аўтаномнай рэспублікі Уладзімір Канстанцінаў. «Артэк» мы ім не аддадзім, — адзначыў ён. — Гэта наш сімвал, мы падумаем, у чыё падпарадкаванне яго перавесці. Вядома, ён застанецца міжнародным аздараўленчым дзіцячым лагерам». Канстанцінаў таксама падкрэсліў, што «Артэк» — гэта «брэнд Саюза, для вялікай колькасці людзей, якія жылі ў СССР». «Артэк», размешчаны на паўднёвым беразе Крыма, быў заснаваны ў першай палове XX стагоддзя. Ён стаў самым вядомым дзіцячым лагерам у СССР, дзе адпачывалі дзеці ў тым ліку і з-за мяжы. Сёння міжнародны дзіцячы цэнтр «Артэк», паводле інфармацыі на яго сайце, з'яўляецца дзяржаўным прадпрыемствам Украіны, знаходзіцца ў падпарадкаванні Дзяржаўнага кіраўніцтва справамі ўкраінскага прэзідэнта. Раней кіраўніцтва Крыма абвясціла, што ўласнасць Украіны на тэрыторыі паўвострава будзе нацыяналізавана. Радовішча нафты і газу ў Чорным і Азоўскім морах, у тым ліку «Адэскае» і «Безназоўнае», а таксама бурыльныя ўстаноўкі «Чарнаморнафтагаза» цалкам пяройдуць ва ўласнасць Крыма.

ISSN 1990 - 763X

### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## КОЛЬКІ ВАДЫ ТРЭБА ВЫПІВАЦЬ ШТОДНЯ?

Усім добра вядома, што чалавеку жыццёва неабходна падтрымліваць дастатковы ўзровень вадкасці ў целе. А людзям, якія будуць сачыць за фігурай і знешняй прыгажосцю ў цэлым, асабліва неабходна адсочваць паказчыкі спажывання вады, заяўляюць медыкі. Ёсць фізіялагічная норма спажывання вады кожным чалавекам, яна складае 30 мілілітраў на 1 кг вагі чалавека. Напрыклад, калі ваша вага 70 кілаграмаў, то норма спажывання вадкасці 30 х 70 = 2,1 літра. Сюды ўваходзіць уся вадкасць, якая выкарыстоўваецца чалавекам на працягу дня: вада, чай, сокі. Малако і суп — гэта ўжо ежа. Людзям у гарачым клімаце і спартсменам трэба піць больш, зыходзячы з формулы 50 мілілітраў на кілаграм вагі. Абязводжванне арганізма вельмі небяспечнае для здароўя. Лічыцца, што калі чалавек адчуў смагу, яго арганізм ужо абязводжаны. Таму кожныя 1,5-2 гадзіны піце па 100-200 мілілітраў вадкасці.



### КОРАТКА

Сустрэча на ўзроўні намеснікаў кіраўнікоў МЗС краін СНД, якую планавалі правесці ў Мінску 14 сакавіка, не адбудзецца з-за афіцыйнай адмовы ад удзелу ўкраінскага боку.

ААТ «ААБ Беларусбанк» пачало выпуск міжнародных картак VISA і MasterCard з рахункам у расійскіх рублях.

Вікторыя Азаранка адмовілася ад удзелу ў тэнісным турніры ў Маямі. Адмова ад выступлення выклікана траўмай ступні.

У Беларусі дазволена выкарыстоўваць электронныя таварна-транспартныя накладныя. Электронныя таварна-транспартныя і таварныя накладныя ў выглядзе электронных дакументаў лічацца створанымі, калі яны падпісаны электронным лічбавым подпісам удзельнікаў электроннага абмену данымі, перададзены і атрыманы праз аператара электроннага дакументаабароту.

У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску адкрылася мемарыяльная выстаўка скульптара Уладзіміра Жбанава «Ад мяне», прымеркаваная да 60-годдзя з дня нараджэння майстра.

■ Наш эксперымент

## ЗНАЙСЦІ ДЫЛЕРА ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЗІНЫ

### ўдалося карэспандэнту «Звязды»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**«Міксы», «маркі», «спайсы»... Праваахоўнікі і ўрачы б'юць трывогу: хваля псіхатропных рэчываў літаральна захліствае Беларусь. Іх ужыванне стала фатальным за апошнія два месяцы ў Мінску для сямі маладых людзей, у якіх наперадзе было ўсё жыццё... Распаўсюджваецца гэтая атрута пераважна з дапамогай віртуальнай прасторы, у якой юнакі і дзяўчаты праводзяць усё больш часу. Таму карэспандэнт «Звязды» правёў эксперымент: а ці насамрэч так лёгка здабыць зелле?**

Стаўлю сябе на месца чалавека, які жадае набыць допінг для падробкі шчасця... Апынуўшыся на старонцы папулярнага пошукавіка, пачынаю ўводзіць фразу, і ўжо на пятым сімвале ў вялікім спісе з'яўляецца патрэбны радок. Значыць, колькасць запытаў маленькай назваць не атрымліваецца. З дапамогай спецыяльнага сэрвісу, які дапамагае адсочваць папулярнасць запытаў, высвятляю, што агульная колькасць іх з такімі словамі ў месяц дасягае некалькіх тысяч...

СТАР. 6

■ Справы мегаполіса

## ЖЫЛЛЁ ДЛЯ ШМАТДЗЕТНЫХ СЕМ'ЯЎ — ПАД КАНТРОЛЕМ СТАЛІЧНЫХ УЛАД

**Старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька даручыў пракантраляваць тэрміны здачы мінскіх дамоў для шматдзетных сем'яў. Такое рашэнне мэр сталіцы агучыў падчас прамой тэлефоннай лініі з насельніцтвам Мінска.**

Насамрэч пераважная большасць званкоў, якія паступілі на «прамую лінію», тычылася тэмы будаўніцтва жылля ў Мінску. Значная частка зваротаў паступіла ад шматдзетных сем'яў. Многія з іх прад'яўлялі прэтэнзіі па якасці жылля, тэрмінах яго здачы, кошце квадратнага метра і выдзяленні льготных крэдытаў.

Таму мэр сталіцы распарадзіўся ў бліжэйшы час склікаць нараду ў Мінгарвыканкаме па пытаннях жыллёвага будаўніцтва. На яго думку, асаблівай увагі патрабуюць дамы, якія будуюцца не ў панэльным выкананні. У цэлым ёсць вострыя пытанні, а многія праблемы могуць узнікнуць ужо ў бліжэйшы час. Ён акцэнтаваў увагу на тых дамах, дзе падчас будаўнічых работ цана была перагледжана ў бок павелічэння.

Жыхары сталіцы таксама пыталіся пра будаўніцтва новых школ і паліклінік у Мінску. У прыватнасці, жыхары мікрараёна Каменная Горка-3 цікавіліся планамі будаўніцтва школы. Спадар Ладуцька растлумачыў, што сёлета будаўніцтва такой школы не пачнецца. Тэрміны пачатку яе будаўніцтва — апошняя дэкада наступнага года. Што тычыцца новых устаноў аховы здароўя, то ў ліпені сёлета плануецца адкрыць паліклініку ў мікрараёне Дружба. Застаюцца пытанні і аб капітальным рамонце 15-й гарадской паліклінікі. Гэта звязана з тым, што фінансаванне было скарочана. Аднак камітэту па ахове здароўя Мінгарвыканкама будзе даручана даўкамплектаваць паліклініку дадатковым медыцынскім абсталяваннем, удакладніў пазіцыю мэрыі Мікалай Ладуцька.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Факт

### ЦЯГНІКІ ВА УКРАІНУ — ПА ГРАФІКУ

**Як паведамілі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі, продаж білетаў на ўсе цягнікі, што курсіруюць з нашай краіны ва Украіну, уключаючы і Крым, і ў зваротным кірунку, не прыпыняўся і вядзецца ў штатным рэжыме.**

У зносінах Беларусь — Украіна курсіруе 11 пар міжнародных цягнікоў фарміравання Беларускай чыгункі, якія звязваюць нашу краіну са сталіцай Украіны, а таксама яе буйнымі адміністрацыйнымі і рэгіянальнымі цэнтрамі. Гэта цягнікі № 86/85 Мінск — Кіеў, № 94/93 Мінск — Адэса, № 374/373 Баранавічы — Кіеў, №330/329 Баранавічы — Жытомір, № 384/383 Баранавічы — Марыупаль, № 371/372 Магілёў — Чарнаўцы, № 302/301 Мінск — Адлер, № 390/389 Мінск — Анапа, № 356/355 Мінск — Мінеральныя Воды, № 100/99 Мінск — Сімферопаль, № 393/394 Полацк — Сімферопаль.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ПРА ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ

**Удзельнікі студэнцкай вучэбна-навуковай лабараторыі «Юрыдычная клініка», якая дзейнічае ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Скарыны, будуць у дзень Канстытуцыі ажыццяўляць кансультаванне па грамадзянскіх справах.**

Пад кіраўніцтвам выкладчыка юрысты-пачаткоўцы бясплатна адкажуць на пытанні гамяльчан. Акрамя таго, студэнты юрфака пры садзейнічанні Гомельскага гарвыканкама правядуць некалькі прававых інтэрактыўных заняткаў з навучэнцамі ўстаноў сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі Гомеля на тэму: «Канстытуцыя — асноўны Закон Рэспублікі Беларусь». Такім чынам навучэнцы даведаюцца пра значэнне Канстытуцыі, асновы канстытуцыйнага строю Беларусі, канстытуцыйныя правы і абавязкі грамадзян. Занятак праводзіцца па метадзе «Роўны навучае роўнага».

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### МЕТРО «ЗАМІНІРАВАЛІ»... ПЕРШАКЛАСНІКІ

**За адзін дзень мінскія школьнікі двойчы паведамлялі ілжывую інфармацыю пра небяспеку ў метро. У абодвух выпадках «мінёрамі» аказаліся... першакласнікі з розных раёнаў сталіцы.**

Паводле інфармацыі прэс-службы ГУУС Мінгарвыканкама, першы званок па тэлефоне 102 паступіў у 9.26. Дзіцячы голас паведаміў пра тое, што ў метрапалітэне рыхтуюцца выбухі. З улікам таго, як была пададзена інфармацыя, і голасу, што прагучаў, адразу ж з'явіліся сумненні ў праўдзівасці даведзенай інфармацыі. Тым не менш у метрапалітэне былі ўзмоцнены меры бяспекі, а таксама выдзелены дадатковыя сілы для праверкі станцый. Тым часам супрацоўнікі міліцыі прыступілі да пошуку таго, хто званіў. Тэхнічныя магчымасці дазволілі хутка вызначыць нумар абанента і месца, адкуль быў зроблены званок. Было ўстаноўлена, што з тэлефона бацькі званіў першакласнік адной са школ Маскоўскага раёна, які такім чынам вырашыў з прыяцелямі пажартаваць.

Другое падобнае паведамленне паступіла ў міліцыю ў 12.22: зноў дзіцячы голас паведаміў пра небяспеку ў метро — пажар. Праваахоўнікі хутка ўстанавілі асобу і гэтага абанента. Карыстальнікам тэлефона аказаўся таксама першакласнік, але ўжо з Заводскага раёна.

За такія «жарты» давядзецца адказваць. Найперш — бацькам дзяцей. Як мінімум, яны могуць быць аштрафаваныя на значную суму. Дарэчы, адзін з папярэдніх ілжэмінёраў за свой учынак мусіў заплаціць штраф у 10 мільёнаў рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ У парламенце

# ПРЫНАДА ДЛЯ ІНВЕСТАРА

**За «круглым сталом» у Савеце Рэспублікі сенатары, дэпутаты парламента, эксперты, прадстаўнікі цэнтральнага банка, буйных кампаній і міністэрстваў шукалі спосабы прыцягнення ў беларускую эканоміку замежнага капіталу.**
**Нагодай для размовы сталі прамежкавыя вынікі маніторынгу ў практыцы прымянення законаў, якія рэгулююць інвестыцыйныя працэсы ў краіне. Падобны маніторынг — новы кірунак дзейнасці верхняй палаты парламента. Яго мэта — абмеркаванне і своечасовая карэкціроўка надзвычай важных для краіны заканадаўчых актаў. Тэма, якую Пастаянная камісія Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах вынесла на абмеркаванне, вельмі актуальная яшчэ і таму, што сёння ў парламенце знаходзіцца закон аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве, які павінен актывізаваць удзел прыватных інвестараў у беларускай эканоміцы.**

### ГАРАНТЫІ, ПРАЗРЫСТАСЦЬ І ЗРУЧНАСЦЬ

Разам з тым, **намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Анатоль РУСЕЦКІ** заклікаў пытанне прыцягнення інвестыцый не разглядаць вузка. «Недастаткова казаць толькі пра законы», — сказаў ён.

Удзельнікі «круглага стала» не абмяркоўвалі і саму неабходнасць прыцягнення ў Беларусь замежнага капіталу. Яны пагадзіліся з тым, што ў краіне недастаткова сродкаў, каб стварыць і развіць новыя вытворчасці, новыя галіны ў эканоміцы, таму вельмі важна, каб замежныя інвестары ўкладвалі сродкі ў Беларусь. Задача такая ўзнікла не ўчора. За апошнія гады было прынята некалькі законаў і іншых прававых дакументаў, якія павінны былі павысіць прывабнасць Беларусі для замежных інвестараў. Аднак дабіцца такога прытоку капіталу ў нашу краіну, які адпавядала забяспечыў бы яе эканамічны рост, пакуль не ўдаецца.

— Прыйшоў час крытычна ацаніць нашы пажаданні і магчымасці, каб змяніць сітуацыю, — паведаміў мадэратар пасяджэння **Уладзімір ПАНЦЮХОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па бюджэце і фінансах.**

Ён расказаў пра вынікі праведзенага Пастаяннай камісіяй маніторынгу. Сенатары атрымалі 70 заўваг ад суб'ектаў інвестыцыйнага працэсу і вучоных, з іх 50 — з прапановамі па рэалізацыі. Асноўнымі перашкодамі для росту інвестыцый названы высокія падаткі, дарагія крэдыты і энергарэсурсы.

На фарміраванне прывабнага для ўкладання грошай іміджу краіны ўплываюць стабільнасць умоў інвеставання, наяўнасць гарантый абароны правоў уласнасці, зразумелыя правілы гульні на рынку. Таму адной з галоўных прапаноў стала замацаванне на ўзроўні закона парадку вызначэння памеру і ўмоў кампенсацый у дачыненні да ўсіх інвестыцый у Беларусі пры правядзенні нацыяналізацыі.

Інвестары таксама скардзяцца на складанасць пошуку і атрымання зямельных участкаў для стварэння вытворчых плошчаў. Праблемнай для рэалізацыі праектаў яны называлі галіну альтэрнатыўнай энергетыкі: з-за недасканаласці нарматыўна-прававой базы і адсутнасці механізму рэалізацыі прадугледжаных заканадаўствам ільгот.

— Асаблівая тэма — пазіцыя рэгіёнаў, — заўважыў Уладзімір Панцюхоў. — У мясцовых улад адсутнічае матывацыя шукаць інвестыцыі, бо паказчык прыцягнення інвестыцый улічваецца не па месцы прыкладання інвестыцыйнага капіталу, а па месцы рэгістрацыі інвестара.

Прамежкавы аналіз дзеючага заканадаўства паказаў неабходнасць паправак у законы аб канцэсіях, аб аднаўляльных крыніцах энергіі, аб архітэктурнай, горадабудаўнічай дзейнасці ў Беларусі, рэзюмаваў старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах. Неабходна таксама ўдасканальваць заканадаўства, якое рэгулюе інвестыцыйную дзейнасць у рэгіёнах. Шэраг прапаноў мае на ўвазе змены ў заканадаўстве, якое звязана з маёмасцю.

— Наша задача — зрабіць усё, каб інвестар зразумеў, што ўкладанні ў Беларусь выгадныя і надзейныя, — лічыць сенатар. — Прапаную кіравацца пры гэтым наступным прынцыпам: умовы для інвестыцыі калі і змяняць, то толькі ў лепшы бок.

### ТЭМП ЁСЦЬ, ПЛЁНУ МАЛА

Калі азірнуцца назад, то можа падацца, што Беларусь у сферы інвестыцый зрабіла сапраўдны прарыў. Такое ўражанне склалася ад агучаных прадстаўніком Міністэрства эканомікі лічбаў. У 2001—2013 гг. тэмп інвестыцый у асноўны капітал у два разы перавышаў тэмп росту валавога ўнутранага прадукту. З 2008 па 2013 год у эканоміку ўкладаліся сумы $15—20 млрд штогод. Колькасць камерцыйных арганізацый з замежнымі інвестыцыямі за апошнія 7 гадоў павялічылася амаль удвая. На 1 студзеня 2014 года заключана і дзейнічае 1248 інвестыцыйных дагавораў на суму каля $35 млрд.

Аднак усе лічбы адносныя. Гэта можна сказаць і пра чатырохкратнае скарачэнне адрыву Беларусі ад краін Еўрапейскага саюза па ўзроўні назапашаных замежных інвестыцый без уліку запазычанасці. У 2006 годзе мы адставалі ад аб'яднанай Еўропы ў 42 разы, а цяпер толькі... у 10 разоў.

Такім чынам, рух наперад відавочны, але да таго, каб быць задаволенымі, нам пакуль далёка. З гэтым звязаны і перамены ў інвестыцыйнай палітыцы нашай краіны. Яе мэта цяпер не тэмпы росту, а эфектыўнасць укладання грошай.

— Ва ўмовах недахопу ўнутраных крыніц фінансавання асноўнай задачай стала прыцягненне сродкаў замежных інвестараў. Пры гэтым маюцца на ўвазе не толькі грошы, але і ноу-хау ў тэхналогіях, менеджменце, маркетынгу, якія дазваляюць дасягнуць больш высокага ўзроўню вытворчасці працы з меншымі тэрмінамі і выдаткамі, — паведаміў **Сяргей ВАЙЦЯХОЎСКІ, начальнік галоўнага ўпраўлення інвестыцый Міністэрства эканомікі Беларусі.**

### УКЛАДВАЮЦЬ ТУДЫ, ДЗЕ СТАБІЛЬНА

Пра залежнасць прамых замежных інвестыцый (якія дазваляюць рэалізаваць буйныя і важныя праекты) ад макраэканамічнай стабільнасці (стабільнасці цэн, абменнага курсу нацыянальнай валюты і іншых умоў) казаў за «круглым сталом» Савета Рэспублікі **Дзмітрый КАЛЕЧЫЦ, начальнік Галоўнага ўпраўлення манетарнай палітыкі і эканамічнага аналізу Нацыянальнага банка Беларусі.**

— У Беларусі сярэдні паказчык інфляцыя за апошнія 12 гадоў склаў каля 38%. Адпаведна, мы займаем адно з апошніх месцаў па ўзроўні прыцягнення прамых замежных інвестыцый у адносінах да ВУП, — сказаў ён. — Адсутнасць макраэканамічнай стабільнасці перашкаджае рэалізацыі доўгатэрміновых праектаў з удзелам замежных інвестыцый і, як следства, запавольвае тэмп эканамічнага росту краіны.



У краіне саспеў пераход да палітыкі падтрымання макраэканамічнай стабільнасці як самай важнай умовы ўстойлівага эканамічнага развіцця, паведаміў Дзмітрый Калечыц. У сувязі з гэтым галоўная мэта грашова-крэдытнай палітыкі ў 2014 годзе — запавольванне інфляцыі з леташніх 16,5% да 11%. Прадстаўнік цэнтральнага банка папярэдзіў, што жорсткая манетарная палітыка будзе захоўвацца, і хоць узровень працэнтных ставак зменшыцца, але аб'ём крэдытаў застанецца абмежаваным. Таму вельмі важна павысіць эфектыўнасць іх выкарыстання.

### «КАЛІ НАМ СТВАРЫЦЬ ТАКІЯ ЎМОВЫ, МЫ І БЕЗ ІНВЕСТАРА СПРАВІМСЯ»

Пра паспяховы вопыт прыцягнення замежных інвестыцый праз выхад на фондавую біржу расказаў **былы кіраўнік буйнейшага вытворцы жаночай бялізны ва Усходняй Еўропе — кампаніі «Мілавіца» — Дзмітрый ДЗІЧКОЎКІ:**

— Выхад на фондавую біржу дае кампаніі некалькі ключавых пераваг. Па-першае, гэты інструмент прымушае пераходзіць на міжнародныя стандарты фінансавай справаздачнасці. А гэта — цалкам іншы погляд на эканоміку прадпрыемства. Другое, што вельмі важна для дзяржавы як асноўнага ўладальніка актываў (70% эканомікі ВУП ствараецца дзяржаўным сектарам), — рэальная ацэнка кошту кампаніі. Трэцяя перавага — доступ да рынку замежнага капіталу.

«Мілавіца» праз выхад на фондавыя рынкі прыцягнула на першым этапе 10 млн еўра, на другім — 5 млн еўра. Дзякуючы атрыманым грошам было адкрыта 600 магазінаў па ўсім свеце, створаны лагістычны цэнтр. Але самае галоўнае, лічыць былы кіраўнік, кампанія можа прагназаваць сваю будучыню.

На іншыя праблемы ў пошуку замежных інвестараў звярнула ўвагу **сенатар і намеснік генеральнага дырэктара ААТ «Гродна Азот» Тамара ПАСЛЕДНЯЯ.**

— Наша прадпрыемства ўжо 10 гадоў спрабуе знайсці інвестара. Не ведаю, добра гэта ці дрэнна, але — беспаспяхова, — сказала яна. — На наш погляд, вельмі значна стрымлівае інвестыцыйную актыўнасць дзяржаўнае рэгуляванне. Прадстаўнікі Міністэрства эканомікі з патэнцыйным інвестарам пагаджаюцца, выказваюць гатоўнасць ісці на ўступкі, інакш ён больш не прыйдзе. Але калі для нашага прадпрыемства стварыць такія ўмовы, то мы і без інвестара справімся, ён нам не патрэбны.

**Галоўны рэдактар «Эканамічнай газеты» Леанід ФРЫДКІН** казаў пра супярэчнасць паміж нашымі чаканнямі эфекту ад замежных інвестыцый і цікавасцю саміх інвестараў. «Прадпрыемствы з замежнымі інвестыцыямі ствараюцца як спосаб прасоўвання сваіх тавараў на рынкі Адзінай эканамічнай прасторы, — казаў ён. — У значна меншай ступені замежныя інвестары заклапочаны тым, каб прывесці сюды новыя тэхналогіі і сучасны менеджмент. Крэдыторская запазычанасць перад замежнымі інвестарамі ў вялікай ступені і стварыла нам адмоўнае сальда ў знешнім гандлі. Пры гэтым беларускае заканадаўства значна менш стымулюе прыцягненне рэальных замежных інвестыцый у статутныя фонды, чым процідзейнічае такой сістэме».

Ключавое пытанне ў тым, лічыць эксперт, каб даць магчымасць замежным інвестарам тут зарабляць. «Не толькі праз прыбытак па даных бухгалтарскага ўліку, але і праз павышэнне кошту саміх беларускіх прадпрыемстваў, якія з'яўляюцца аб'ектамі іх інвеставання». Аднак гэта ўпіраецца ў неразвітасць фондавага рынку ў Беларусі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

### ІДЭАЛЬНЫ ДЛЯ БАЛЕЛЬШЧЫКАЎ — «АГІНСКІ»

**Кавярня з такой назвай стала лепшым аб'ектам грамадскага харчавання ў рамках падрыхтоўкі да чэмпіянату свету па хакеі. Таксама ў ліку прызёраў аказаліся рэстаран «Эрыван» і кавярня «Атэлье».**

Усяго ў конкурсе ўзялі ўдзел 12 рэстаранаў, бараў і кавярняў, якія прадставілі кожны раён горада. Перш за ўсё пры ацэнцы ўлічваліся знешні выгляд аб'екта, інтэр'ер залы, якасць і асартымент прадукцыі. Таксама нямала ўвагі надавалася культуры абслугоўвання, якасці паслуг, належнаму санітарнаму стану, стабільнасці працы прадпрыемства і выкананню ім сацыяльных гарантый у дачыненні да супрацоўнікаў.

Паколькі конкурс праводзіўся ў рамках падрыхтоўкі да чэмпіянату свету па хакеі, адным з найважнейшых фактараў для перамогі была наяўнасць меню на замежных мовах, тэрміналаў для безнаяўных разлікаў, плазменных экранаў, Wi-Fi і ўменне персаналу размаўляць на замежных мовах.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

### ДРУГАЯ «БРОНЗА» ШАПЦЯБОЯ

**Беларускі біятланіст Васіль Шапцябой заваяваў другую бронзавую ўзнагароду на Паралімпійскіх гульнях у Сочы. Гэтым разам наш суайчыннік паказаў медальны вынік у гонцы на 12.5 км сярод слабавідушчых.**

На чатырох агнявых рубяжах Васіль дапусціў чатыры промахі. Праўда, дзякуючы добрай хуткасці ён здолеў захаваць трэцяе месца і патрапіць на п'едэстал. А перамогу, як і ў папярэдняй гонцы, заваяваў украінец Віталь Лук'яненка. На другім радку апынуўся расіянін Мікалай Палухін.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

### ДАРОГІ — БЕЗ АБМЕЖАВАННЯЎ

**Сёлета Міністэрства транспарту і камунікацый не будзе ўводзіць веснавыя абмежаванні на восі транспартных сродкаў у дачыненні да рэспубліканскіх аўтамабільных дарог агульнага карыстання.**

Гэтае рашэнне прынятае ў сувязі з анамальным тэмпературным рэжымам, які ўсталяваўся ў краіне з сярэдзіны лютага: адсутнасць снегавога покрыва і дынаміка адтавання грунту на адкрытай мясцовасці. Разам з тым, адзначаюць спецыялісты міністэрства, аслабленне дарожнага «адзення» і магчымыя дэфармацыі могуць адбывацца на асобных участках аўтадарог з неспрыяльнымі грунтовымі і гідралагічнымі ўмовамі — у месцах, дзе земляное палатно можа быць пераўвільготненым. У сувязі з гэтым дарожным арганізацыям даручана арганізаваць пастаяннае назіранне за такімі ўчасткамі і, у выпадку ўзнікнення пагрозы разбурэння пакрыццяў, прымаць прадугледжаныя заканадаўствам захады па змяненні рэжымаў руху транспарту.

### ВОЎК НА... ПРЫВАТНЫМ ПАДВОРКУ

**У адным з двароў на тэрыторыі прыватнага сектара ў сталічным мікрараёне Сухарава супрацоўнікі крымінальнага вышуку Фрунзенскага РУУС, якія праводзілі аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы, устанавілі факт пражывання... ваўка.**

Для дакладнага вызначэння відавой прыналежнасці дзікай жывёлы запрасілі супрацоўніка Цэнтра па біярэсурсах Нацыянальнай акадэміі навук, а таксама прадстаўнікоў інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету, прадпрыемства «Мінсклясгас» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Уладальнік звера патлумачыў, што пяць гадоў таму купіў у Расіі двух ваўкоў. Праз некалькі гадоў у іх нарадзіліся тры шчанюкі, адзін з якіх выжыў. Дарослую пару гаспадар падарыў знаёмым, а ваўчанё пакінуў сабе і пасадзіў яго на ланцуг. Трэба сказаць, што звер утрымліваўся ва ўмовах, якія не адпавядалі існуючым патрабаванням па пражыванні і развядзенні дзікіх жывёл у няволі. За гэтае парушэнне гаспадару 10-месячнага драпежніка пагражае штраф у памеры да 20 базавых велічынь. Рашэнне аб далейшым месцы знаходжання ваўка павінны будуць вырашыць спецыялізаваныя службы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ЯНЫ НЕ ВЕРЫЛІ, ШТО ВЯСНА ПРЫЙШЛА

**Аматары падлёднай рыбалкі, якія дагэтуль не верылі ў прыход сапраўднай вясны, пераканаліся ў гэтым бясспрэчным факце.**

52-гадовы жыхар Рагачова на прытоку Дняпра праваліўся пад лёд. Выратаваць яго не ўдалося. А ў Рэчыцкім раёне з рыбалкі не вярнуўся жыхар Расіі. Ён на беразе возера каля вёскі Пескаполле пакінуў аўтамабіль і пайшоў лавіць рыбу. Урэшце на лёдзе знайшлі толькі снасці. Цела выратавальнікі шукаюць. Больш пашанцавала гамяльчаніну, які вырашыў скараціць шлях дадому і пайшоў праз кар'ер, што знаходзіцца побач з праспектам Касманаўтаў. 23-гадовага мужчыну супрацоўнікі МНС дасталі з вады з дапамогай спецыяльнай дошкі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

УНП 600041880

**ОТЧЕТ О РЕЗУЛЬТАТАХ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**
**ОАО «Вишневка-2010» Минского района за 2013 год**

| № п/п | Наименование показателя | На конец отчетного периода, млн руб. |
|---|---|---|
| | **АКТИВЫ** | |
| 1 | Долгосрочные активы | 50.176 |
| 2 | Краткосрочные активы | 41.162 |
| | БАЛАНС | 91.338 |
| | **ПАССИВЫ** | |
| 1 | Собственный капитал | 48.023 |
| 2 | Долгосрочные обязательства | 9.312 |
| 3 | Краткосрочные обязательства | 34.003 |
| | БАЛАНС | 91.338 |
| | Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | 7.527 |
| | Чистая прибыль (убыток) | 5.034 |
| | Рентабельность | 13,9% |

■ Табе, абітурыент!

## «КАНТРОЛЬНАЯ» РЭПЕТЫЦЫЯ

**Заключны, трэці этап рэпетыцыйнага тэсціравання стартаваў у беларускіх ВНУ. У першых двух яго этапах узялі ўдзел каля 92 тысяч чалавек. Але менавіта трэці этап традыцыйна прыцягвае найбольшую ўвагу з боку абітурыентаў, паколькі трэцяя спроба рэпетыцыйнага тэсціравання заўсёды максімальна набліжаная да будучага цэнтралізаванага тэсціравання. Да таго ж у красавіку ўжо пройдзена ўся школьная праграма, і гэта самы зручны час, каб праверыць свае веды.**

Як вядома, да канца сакавіка павінна быць зацверджана новая рэдакцыя правілаў прыёму ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Арганізатары ЦТ запэўніваюць, што змен у структуры тэставых іспытаў новая рэдакцыя не змяшчае, хоць раней і агучвалася ідэя ўвядзення інтэграваных тэстаў. Яе аўтары прапанавалі аб'яднаць у адным тэсце рускую і беларускую мову, а ў другім — гісторыю Беларусі, сусветную гісторыю і грамадазнаўства. Аднак аргументаў супраць такога новаўвядзення аказалася значна больш.

Арганізатары цэнтралізаванага тэсціравання нагадваюць абітурыентам, што для паспяховай здачы ўступных экзаменаў патрабуецца не толькі добрае валоданне вучэбным матэрыялам і сістэматызацыя ведаў, але і навыкі запаўнення бланка адказаў, паколькі ў стрэсавай абстаноўцы сапраўднага экзамену зусім няма часу задумвацца над «дробнымі» тэхнічнымі момантамі. Гэта цэлая навука — як уносіць у клетачкі адзінкі вымярэння (градусы, працэнты, метры і тоны), лічбавыя адказы ў выглядзе дробу, сімвалы хімічных элементаў, адказы, якія складаюцца з двух слоў і гэтак далей. Адным словам, «тэхнічная адаптацыя» патрэбна кожнаму новаму пакаленню абітурыентаў.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Таксама абітурыенты могуць праверыць свае веды і з дапамогай камп'ютарнага тэсціравання, якое праводзіцца толькі на базе Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў у Мінску.

Існуюць тры рэжымы камп'ютарнага тэсціравання. **У трэніровачным рэжыме** ўдзельнік не абмежаваны ў часе праходжання тэста, а таксама ў любы момант ён можа скарыстацца падказкай камп'ютара. У **кантрольным рэжыме** на рашэнне тэста адводзіцца такі ж час, як і на ЦТ, і выконваецца ён без падказак. Самы ж набліжаны да ўмоў ЦТ — **кантрольны рэжым на бланку:** тут таксама абмежаваны час, адсутнічаюць падказкі, але правільныя адказы трэба ўносіць у электронную версію бланка, які цалкам адпавядае арыгіналу бланка ЦТ.

Перавага камп'ютарнага тэсціравання ў тым, што абітурыент адразу даведаецца свой вынік, а таксама ў яго ёсць магчымасць зрабіць работу над памылкамі, убачыць аўтарскае рашэнне задачы і правільны адказ. Тэсты, якія выконваюцца на камп'ютары, адрозніваюцца па змесце заданняў ад тых, якія рыхтуюцца для пунктаў тэсціравання. Таму абітурыенты, якія ўжо прайшлі рэпетыцыйнае тэсціраванне, могуць яшчэ раз праверыць свае веды ўжо на камп'ютары. Зарэгістравацца для праходжання камп'ютарнага тэсціравання можна на сайце РІКВ www.rikc.by ў раздзеле «камп'ютарнае тэсціраванне».

Для павышэння эфектыўнасці ад удзелу ў «рэпетыцыі» ЦТ можна скарыстацца паслугамі рэгіянальнага цэнтра тэсціравання і прафесійнай арыентацыі моладзі пры Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я.Купалы, які ўжо не першы год арганізуе пры падтрымцы Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў індывідуальныя кансультацыі для ўдзельнікаў рэпетыцыйнага тэсціравання. Там могуць пракансультаваць любога абітурыента, незалежна ад пункта праходжання тэсціравання і месца яго жыхарства. Мэта такой кансультацыі — ліквідацыя прабелаў у ведах і далейшая падрыхтоўка па тэматыцы тэставых заданняў, з якімі абітурыенты не справіліся на «рэпетыцыі» экзамену.

Індывідуальная кансультацыя ўяўляе сабой рассылку вучэбна-метадычнага пакета, які змяшчае тэматыку раздзелаў школьнай праграмы па кожным няправільна выкананым заданні з указаннем года ці класа вывучэння адпаведнага раздзела, з рэкамендаваным спісам вучэбнай і метадычнай літаратуры, са зместам няправільна выкананых заданняў, правільнымі адказамі і ўказаннем да правільнага рашэння.

Індывідуальным кансультаваннем у рэжыме анлайн займаюцца і ў Ліцэі БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

**РУП «Институт недвижимости и оценки»**

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА НЕСВИЖСКОГО РАЙОННОГО ПОТРЕБИТЕЛЬСКОГО ОБЩЕСТВА

| Лот № 1 | Рыбный цех с подвалом с инв. № 621/С-13965 | Адрес: Минская обл., Несвижский р-н, г. Несвиж, ул. Дзержинского, д. 12а | Начальная цена с НДС, руб. | Задаток с НДС, руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 347 880 000 | 17 394 000 | 5 |

Назначение – здание специализированное иного назначения. Этажей – 1. Площадь застройки/общая – 179 м²/128,6 м². Год постройки – 1936. Фундамент – ж/б. Стены, перегородки – кирпичные. Перекрытия чердачные – ж/б. Крыша – жесть. Полы – цементные, плитка, линолеум. Проемы оконные – остекленные. Проемы дверные – дощатые. Наружная отделка цоколя – оштукатурено. Наружная отделка фасада – под расшивку. Внутренняя отделка – облицовка плиткой, масл. окр. Отопление – трубчатые с нижн. развод. Водопровод – стальные трубы с распр. арм. Электроосвещение – скрытая проводка. Канализация – чугунные трубы.

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 0,0766 га с кадастровым номером 624250100001004686. Целевое назначение – обслуживание рыбного цеха с подвалом. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**ОБРЕМЕНЕНИЯ**

Земельный участок с кадастровым номером 624250100001004686 имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель: земельный участок, находящийся в зонах охраны недвижимых материальных историко-культурных ценностей, код-6, площадь 0,0766 га.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) - Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Оплата стоимости приобретенного на аукционе Объекта осуществляется в срок, который будет установлен в договоре купли-продажи между Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение аукциона в размере, не превышающем 8 000 000 руб. на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона.

**Цель использования Объекта согласно целевому назначению не ограничивается.**

**Аукцион состоится 16.04.2014 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос.регистрации и извещения о присвоении УНП; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ. лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ № 703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (рыбный цех с подвалом) Несвижского РАЙПО, проводимом 16 апреля 2014 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа от участия в аукционе.

**Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 2. Окончание приема заявлений 11.04.2014 в 12.00.**

**Заключительная регистрация участников 16.04.2014 с 11.30 до 12.00 по месту проведения аукциона.**

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: Евгений Николаевич 8 (029) 955 97 27.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять Объект (лот) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

☎ **Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: 193319@mail.ru**

TV@R

Павел БАРАНАЎ:

# «КАМЕНТАТАР ПАВІНЕН СТВАРАЦЬ НАСТРОЙ»

**Некалі ён марыў быць... машыністам лакаматыва. З узростам спіс захапленняў папоўніўся спортам і музыкай. Таму, калі мара пра чыгунку не спраўдзілася, пайшоў на журфак. А пасля заканчэння вырашыў усё ж прысвяціць сябе спартыўнай тэматыцы. І сёння ўваходзіць у лік лепшых спартыўных каментатараў краіны. Куды расці, калі ты на вяршыні прафесіі? Як трапіць туды самастойна і не згубіць уласных прынцыпаў?! Адказы на гэтыя пытанні вядучы праграмы «Фактар сілы» і каментатар Белтэлерадыёкампаніі Павел БАРАНАЎ ілюструе ўласнай біяграфіяй.**



***— Раскажыце, як трапілі ў «абойму» каментатараў?***

— Пачынаў, па вялікім рахунку, з захаплення музыкай. Але, хоць музыка мяне і вельмі прываблівала, яшчэ ў старэйшых класах школы я стаў балельшчыкам. Спачатку «хварэў» за хакейнае «Дынама», потым за футбольнае. А потым вырашыў: нядрэнна будзе сумясціць карыснае з прыемным. І падаўся ў спартыўную журналістыку. Зноў жа не меў ніякага ўяўлення пра тое, як і дзе складзецца ў мяне нешта. Практыку я праходзіў тут, на тэлебачанні, і ў выніку сюды мяне і размеркавалі. Шчыльна заняўся спартыўнай журналістыкай. Аднак стаўкі на тое, каб стаць спартыўным каментатарам, я не рабіў. Калі працуеш на тэлебачанні ў гэтай тэме, то, у прынцыпе, лагічна дапускаць, што можаш у перспектыве стаць ім. Гэта свайго роду вышэйшы пункт для спартыўнага тэлевізійнага журналіста. Мой каментатарскі дэбют адбыўся на матчы Мазыра супраць мінскага «Тарпеда» ў 1999 годзе. Потым былі яшчэ матчы, але каментатарства ж патрабуе пастаяннай практыкі, таму тое не ўспрымаю сур'ёзна.

Паўнавартасным дэбютам лічу 2002 год, падчас чэмпіянату свету. Гэта быў час усім добра вядомай сітуацыі, калі тэлевізійны рынак у нас толькі з'яўляўся. І вось Расія «абсякае» ўсе свае каналы футбольных трансляцый. Шум, паніка — усе хочуць глядзець футбол. Так атрымалася, што за адзін тур да завяршэння групавога этапу купілі правы на трансляцыі і трэба было каментаваць гульню на беларускай мове. Першы матч быў паміж зборнымі Турцыі і Коста-Рыкі, як сёння памятаю...

***— Засталіся задаволены вынікам працы?***

— На самай справе вельмі складана рабіць першыя крокі ў такой атмасферы. Навічку даводзілася каментаваць чатыры матчы ў дзень! Нават для прафесіянала гэта экстрэмальная нагрузка. І дапамагчы было няма каму. Разам з тым, гэта ўнікальны вопыт. Не думаю, што варта было чакаць альбо патрабаваць высокага выніку. Каментарый меў нюансы. Але з цягам часу, калі прайшоў «школу» пошуку і станаўлення, загартоўка з'явілася, то пачаў рухацца ў гэтым кірунку. Не ўсё атрымлівалася, аднак заўсёды верыў у свае сілы.

***— Нехта дапамагаў асвойвацца ў прафесіі?***

— Я трапіў у сітуацыю, дзе даводзілася самому сябе ствараць. Так не павінна быць, бо па першым часе патрэбна падтрымка вопытных людзей. Затое цяпер маладым я не адмаўляю ў дапамозе, успамінаючы сябе ў падобных сітуацыях. А тады сам і гузакі набіваў, і памылкі выпраўляў.

***— Пошук сябе ў чым заключаўся?***

— Калі ты малады і без вопыту, то па наіўнасці сваёй шукаеш такую падачу матэрыялу, якую лічыш класнай. Але яна не натуральная. А хочацца ж здавацца разумнейшым, чым ты ёсць, вобразна кажучы. Гэта адбівалася на якасці зробленага. Потым, памятаю, неяк падчас звычайнага прагляду футбольнага матча ў мяне ўзнікла думка: трэба быць проста самім сабой. І з такім падыходам я стаў працаваць у эфіры. Як аказалася, гэта было правільнае рашэнне. І з таго моманту пайшло нармальнае развіццё. Раней неяк не ўдавалася стабільна добра адпрацаваць сезон: з трох матчаў быў альбо адзін дрэнны і два добрыя, ці наадварот. Цяпер усё інакш. Чым, прызнаюся, вельмі задаволены.

***— Можаце вылучыць нейкія паказчыкі прафесіяналізму ў вашай сферы?***

— У нас, як і ў любой іншай прафесійнай сферы, ёсць пэўныя рамкі і патрабаванні. З элементарнага — ніхто мне ніколі не дакажа, быццам чалавек з дэфектамі мовы можа стаць каментатарам. Наконт голасу могуць быць розныя меркаванні, але пры ўмове, што ўсё ў парадку з дыкцыяй, тэмбр — ужо справа густу. У сучасным кантэксце роля каментатара наогул змянілася. У часы адсутнасці інтэрнэту каментатар быў больш значнай фігурай. А сёння мы ў нечым канферансье, якія павінны ствараць атмасферу і настрой. Часта даводзіцца таксама чуць, быццам прафесія адыходзіць у мінулае. Але калі мы праводзілі конкурс каментатараў, то была не адна сотня заявак. Здаецца, факт сведчыць пра адваротнае. Нават па ўласных адчуваннях магу сказаць, што без каментатара глядзець матч не так цікава. А так ты нібыта ў кампаніі. Можна параўнаць гэта з застоллем — падчас сяброўскай бяседы ежа здаецца куды смачнейшай.

***— На ваш погляд, каментатар павінен каментаваць гульню альбо будаваць аповед з адступленнямі?***

— Зноў жа ўсё залежыць ад густу. Нехта хоча, каб разважалі. Яго не столькі цікавяць падзеі на полі — паслухаць бы каментатара. Хаця каментатар толькі абслугоўвае працэс. Напрыклад, Яўген Маёраў быў суперкаментатарам, але я не стаў бы глядзець матч толькі з мэтай яго паслухаць, пры ўсёй маёй павазе да гэтага чалавека. Я гляджу матч, каб даведацца пра падзею, а каментарыі — справа другасная. Словам, я за тое, што каментатар павінен ствараць настрой, які адлюстроўвае падзеі на полі, і абавязкова ўвесці мяне ў курс справы, назваць прозвішчы і ганяць мяч на працягу гульні. Для многіх эталонам у нашай прафесіі з'яўляецца англійскі стыль, а там толькі тое і робяць, што ганяюць мяч і ўжываюць экспрэсіўныя воклічы. Чалавек заўсёды выбірае ў падачы матэрыялу тое, да чаго прывык.

Таксама важна вытрымліваць раўнавагу паміж расповедам пра падзеі на экране і ўласнымі думкамі. Бо, здараецца, нават самыя вопытныя каментатары цікавай думкай адцягваюць увагу ад «карцінкі» на экране. Пажартаваць, выказаць нейкія ацэнкі трэба ўмець да месца. Галоўнае — сачыць за матчам і расказваць пра яго.

***— Даводзіцца працаваць у непрадбачаных умовах?***

— Здараецца рознае. Часам за лічаныя секунды з некім пасварышся, а потым выходзіш у эфір і нават ніхто не здагадваецца, што толькі што размаўляў з кімсьці на павышаных танах. Гледачу няма справы да твайго настрою. У працы нельга па-іншаму. Бывае, табе ў «вушы» паведамляюць нейкую інфармацыю, звязаную з эфірам, і важна, каб яе агучылі, не збіваючы цябе з думкі. Не варта, як кажуць, гаварыць пад руку. Быў у мяне выпадак, калі я каментаваў матч «Арсенал» — «Ліверпуль», а паралельна чуў, як гукарэжысёрская брыгада абмяркоўвала тэму, дзе лепш купіць вясельную сукенку. І недзе на 55-й хвіліне я быў гатовы ў прамым эфіры сказаць, што магу падказаць такое месца. Альбо неяк быў агляд Лігі чэмпіёнаў, а паралельна гучанне класічнай музыкі. Так і каментаваў пад ігру скрыпкі.

**Калі ты малады і без вопыту, то па наіўнасці сваёй шукаеш такую падачу матэрыялу, якую лічыш класнай. Але яна не натуральная.**

***— Як рыхтуецеся да трансляцый?***

— Валоданне тэмай дазваляе з падрыхтоўкай укласціся ў гадзіну. Возьмем, напрыклад, паказ чэмпіянату Англіі, які ў нас транслюецца ўжо гадоў дзесяць. Фрэнк Лэмпард здаецца ўжо добрым старым знаёмым, гісторыі пра якога якраз хопіць распавесці на цэлы тайм. І вось калі ёсць у каментатара такога кшталту багаж ведаў, то перад гульнёй дастаткова проста ацаніць сітуацыю, паглядзець свежыя навіны — словам, быць у курсе падзей. Непасрэдна перад матчам праглядзець змены саставаў, прыкінуць, з чым звязаны перамены ў параўнанні з мінулымі матчамі.

А па маладосці, хоць можа кожны і павінен прайсці праз такі вопыт, бывае, рыхтуешся да адной гульні некалькі дзён. Няправільна, дарэчы, такое рабіць у дзень рэпартажу. Бо, каб вывучыць інфармацыю пра склад невядомай табе каманды, спатрэбіцца не менш за дзевяць гадзін. Уявіце, якім стомленым будзе чалавек у час эфіру.

***— У пачатку размовы вы сказалі, быццам каментатар — гэта вышэйшы ўзровень. Якая ж перспектыва?***

— Займаючыся каментаваннем, можна развівацца ў гэтым рэчышчы бясконца. Паглыбляючыся ў тэму, адшукваючы новыя формы падачы. Каментарый — праца ў нечым падобная да сцэнічнай, як бы пафасна гэтак ні прагучала, бо ўвесь час дапрацоўваеш веды, артыстызм, настрой. Ёсць выраз, быццам язык — адзіная зброя, якая ад частаты выкарыстання становіцца толькі вастрэйшай. І з каментарыем тая ж сітуацыя. Людзі маёй прафесіі, калі не губляюць тонус, то становяцца толькі большымі прафесіяналамі. Калі ты аказаўся перад мікрафонам, то можаш шукаць новыя формы, увасабляць цікавыя ідэі. Напрыклад, цяпер я імкнуся вярнуць у эфір беларускамоўны рэпартаж. Справа зусім не лёгкая, але вельмі важная.

***— Як наогул паставіліся да вашых трансляцый на беларускай мове?***

— Вельмі шмат добрых водгукаў. Шчыра кажучы, я такой рэакцыі нават і не чакаў. Заўваг амаль не было. Аднак людзі, якім беларуская мова ў эфіры не патрэбна, звычайна проста кажуць: маўляў, трэба працаваць чыста, бездакорна. Хто спрачаецца? Але ў гэтай сітуацыі такія водгукі — проста прыкрыццё сваёй пазіцыі. Бо тыя, хто падтрымлівае мой пункт гледжання, пагодзяцца: лепш няхай з невялікімі памылкамі, але мова будзе гучаць. Ніхто ж гадамі не працаваў над гэтым. Напрыклад, мая праца неаднойчы ацэньвалася лінгвістамі і мовазнаўцамі. І, прыемна адзначыць, даволі высока. Безумоўна, над мовай для трансляцый трэба доўга працаваць, але задавальненне ад карыснай справы куды большае ў выніку. У нас двухмоўе, і, здавалася б, што хочаш выбірай. Аднак адстойваць сваю пазіцыю досыць няпроста. Трэба вяртаць людзям мову, бо яна ім патрэбна. Гэта наша краіна, наша мова, якая з'яўляецца своеасаблівым брэндам нашага медыярынку. Акрамя нас, той ці іншы матч на беларускай мове ніхто ў свеце не пракаментуе. Калі мы будзем рабіць трансляцыю па-руску, то як бы добра ні спрацавалі, гэта будзе другасны прадукт. А трэба быць самадастатковай еўрапейскай нацыяй. Без беларускай мовы стаць ёю немагчыма.

**Алена ДРАПКО**

■ Неасабісты суб'ектыў

# ПАВОДЛЕ ТЭОРЫІ ГІЗО



## Наша грамадзянская і чалавечая пазіцыя — у чым яна?

ДНЯМІ жыхар Баранавічаў Аляксей Шугаеў нечакана (мяркую, перш за ўсё для сябе самога) стаў адным з самых папулярных герояў байнета. Пра яго спачатку напісала мясцовая прэса, артыкул передрукаваў адзін з вядомых парталаў — і вось ужо звычайны гараджанін і яго незвычайны ўчынак абмяркоўваюць дзясяткі інтэрнэт-карыстальнікаў. Што ж такога незвычайнага зрабіў Аляксей, спытаеце? У мінулыя выхадныя ён заўважыў, як насупраць супермаркета маладая маці ледзь не перакуліла каляску на роўнай, здавалася б, нядаўна заасфальтаванай дарожцы. Аказалася, асфальт прасеў і ўтварылася ладная яма, праваліўшыся ў якую, мог пакалечыцца любы. Надвор'е было сонечнае, вакол на роліках каталіся дзеці…

Карацей, Аляксей, доўга не думаючы, прывёз у багажніку ўласнай машыны каламажку, рыдлёўку, пясок, яму засыпаў і параўнаваў. Не чакаючы, што гэта зробяць адпаведныя службы, не наракаючы на мясцовую ўладу, якая проста павінна бачыць кожную ямку каля кожнага дома і кожную перагарэлую лямпачку ў пад'ездзе (прызнаемся самі сабе: менавіта так мы часцей за ўсё робім і думаем)… Зрэшты, Аляксею да падобнага геройства (пішу без двухкосся і без іроніі, бо па нашым часе яго ўчынак менавіта так і выглядае), здаецца, не прывыкаць. За некалькі тыдняў да гэтага ён сам зачыніў (наколькі гэта ў яго атрымалася) каналізацыйны калодзеж каля гімназіі, абгарадзіў небяспечны ўчастак саматужным «плотам». Дагэтуль усе хадзілі, глядзелі, абураліся, на мясцовых форумах у інтэрнэце разгарнулася бурнае абмеркаванне, сутнасць якога зводзілася зноў жа да таго, якія благія камунальнікі і якія абыякавыя чыноўнікі (а тыя, што, седзячы за камп'ютарамі, пішуць гнеўныя каментарыі, — свядомыя грамадзяне і барацьбіты за справядлівасць). І раптам знайшоўся чалавек, які не толькі жахнуўся ад уяўлення, што можа здарыцца, калі ў той люк упадзе чыёсьці дзіця, але і задумаўся пра тое, што асабіста ён можа зрабіць, каб трагедыі не здарылася…

НЕ будзем разважаць цяпер пра тое, чаму і сапраўды адпаведныя службы, якія за гэта адказваюць, своечасова не зачынілі той калодзеж, не засыпалі тую яму (гэта тэма для зусім іншай публікацыі, магчыма, нават па матэрыялах праверкі кантралюючых або праваахоўных органаў)… Лепш пра нас з вамі, такіх законапаслухмяных, правільных, прыстойных. Прычым усе гэтыя рысы нярэдка дзейнічаюць толькі ў межах нашай кватэры,

**«Нам самім не трэба быць абыякавымі да праблем, нават калі гэта проста яма. Усе думаюць, што хтосьці іншы павінен выправіць недахопы нашага жыцця. А дастаткова проста спыніцца, патраціць колькі хвілін, дапамагчы сваім учынкам іншаму...»**

нашай сям'і, нашага працоўнага месца. Усё, што адбываецца вакол (нават у нашым жа пад'ездзе, нават на вуліцы, па якой мы штодня ходзім), нас хвалюе толькі на ўзроўні эмоцый: паціснуць плячыма, абурана або пагардліва фыркнуць, або — і гэта ўжо вяршыня нашай чалавечай і грамадзянскай пазіцыі — набраць на камп'ютары злосны каментарый, самому пацешыцца пры гэтым уласнай дасціпнасцю і лёгкасцю стылю. І атрымліваецца ў выніку, што чалавек, які проста зрабіў нармальны чалавечы ўчынак, становіцца героем дня, сучасным Дон Кіхотам, дзіваком, якіх мала. Але чамусьці менавіта з вуснаў гэтага дзівака звычайныя зацяганыя свядомымі грамадзянамі словы гучаць як аксіёма: «Нам самім не трэба быць абыякавымі да праблем, нават калі гэта проста яма. Усе думаюць, што хтосьці іншы павінен выправіць недахопы нашага жыцця. А дастаткова проста спыніцца, патраціць колькі хвілін, дапамагчы сваім учынкам іншаму…»

АЛЕ ўсё не так сумна і змрочна, бо я ведаю, што гэтыя словы не проста пусты гук, а кіраўніцтва да дзеяння, жыццёвы прынцып для многіх людзей — знаёмых і зусім невядомых. У доме побач з нашым сусед кожную раніцу (балазе, працуе ў другую змену) вывозіць на прагулку маладога хлопца-інваліда, маці якога б'ецца на дзвюх работах, каб сын, у мінулым спартсмен, які падаваў надзеі, меў добрыя лекі і харчаванне. Сусед не бярэ за тое грошай, не просіць падзякі — ён проста па-чалавечы дапамагае. У невялікім гарадку Круглае 84-гадовая бабуля пяты год жыве ў чужых людзей, як у роднай сям'і: гаспадыня проста прыняла яе і абагрэла, бо бабцы не было куды ісці. У вёсцы на Гомельшчыне (нядаўна пачула гэтую гісторыю ў аблсавеце) мужыкі сабраліся і паставілі новыя платы ўдовам, старым, нямоглым. Самі, сваімі рукамі, нарэзалі штыкеты, прывезлі з лесу жэрдкі. Не наракаючы на ўладу і адпаведныя службы, не чакаючы, што нехта зверху дасць указанне. Проста людзі дапамаглі людзям… І не толькі людзям, дарэчы. Варта зазірнуць на любы з сайтаў абароны бяздомных жывёл. Гэтыя валанцёры-дзівакі не толькі падбіраюць і даглядаюць кінутых іншымі людзьмі катоў і сабак, нярэдка знявечаных, — яны пішуць ім «візіткі» з фота, спадзеючыся, што ў няшчаснай жывёлкі знойдзецца клапатлівы гаспадар. Яны не лянуюцца, не шкадуюць траціць свой час на цёплыя прачулыя словы, якія знаходзяць для кожнага свайго выхаванца. Хаця, напэўна, маглі б гэты час заняць камп'ютарнымі гульнямі, пошуку вельмі патрэбныхануч у інтэрнэт-магазіне ці сядзеннем на форуме, дзе зноў лаюць чыноўнікаў і нейкія там службы за… (варыянтаў тут безліч)…

Усярэдзіне XIX стагоддзя ў Францыі жыў вельмі цікавы персанаж. Франсуа Гізо, дваццаць другі прэм'ер-міністр Францыі, які, як сведчаць гісторыкі, быў чалавекам даволі жорсткім, прагматычным і зусім не сентыментальным (славуты дэвіз сярэдняга класа «Узбагачайцеся!» прыдумаў менавіта ён). Але пры гэтым ён быў выдатным гісторыкам і філосафам. Дык вось, менавіта ён напісаў гэтую фразу, якая ў перакладзе ці не на ўсе мовы свету — адна з самых вядомых цытат. «Пакуль чалавек адчувае боль — ён жывы. Пакуль чалавек адчувае чужы боль — ён чалавек».

Пакуль што на гэтай зямлі пераважаюць людзі. Прынамсі, вельмі хочацца ў гэта верыць.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**Шаноўныя сябры!**

**Працягваецца падпіска на «Звязду» на II квартал 2014 года!**

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

| Індэкс/перыяд | 1 месяц | 3 месяцы |
|---|---|---|
| 63850 (для індывідуальных падпісчыкаў) | 47 500 | 142 500 |
| 63145 (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў) | 42 750 | 128 250 |
| 63858 (для ведамасных падпісчыкаў) | 95 300 | 285 900 |
| 63239 (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя) | 85 800 | 257 400 |

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 17 САКАВІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.35** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.15** Зона Х.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.05 Камедыя «Падкідыш».**
**11.35** БеларусьLIFE.
**12.10** «Зорнае жыццё». «Паўжыцця за мару».
**13.10 Камедыя «Вяселле ў Малінаўцы».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** «Славянскі базар у Віцебску-2014». Нацыянальны адбор.
**15.30 Баявік «Анёлы Чарлі-2» .**
**17.30** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «Фурцава».**
**0.05** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.50** Дзень спорту.
**1.05 Фантастыка «Суддзя Дрэд».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 10.05, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Цені мінулага».**
**10.40, 23.00 Серыял «Людзі Шпака».**
**11.55 Серыял «Ластаўчына гняздо».**
**13.55 Камедыя «Беражыце жанчын».**
**16.20, 23.55** «Перазагрузка». Ток-шоу.
**17.05** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**18.55 Дэтэктыў «Гульня на выбыванне». 1-я і 2-я серыі.**
**20.50** Рэальны свет.
**21.25** КЕНО.
**21.30 Серыял «Універ. Новы інтэрнат».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.35, 15.00, 17.00, 21.05, 0.40** «Калейдаскоп».
**8.05, 12.40, 15.05, 17.10, 0.50** «Энцыклапедыя беларускага спорту». Бокс.
**8.15 Дзіцячы фільм. «Чатыры нуль на карысць Танечкі».**
**9.40, 22.05** «Дыя@блог». «Пра мову».
**10.10, 21.10 Серыял «Мегрэ».**
**11.00, 0.15** «Святло далёкай зоркі». Памяці кампазітара Леаніда Смялкоўскага.
**11.25, 14.30, 16.25, 19.50** «Размаўляем па-беларуску».
**11.35** «Залаты Віцязь. Мікалай Бурляеў». Дак. фільм.
**12.50** «Скарбніца Міншчыны». Гісторыя, культура і архітэктура мястэчка Даўгінава.
**13.15** «Карані». Скіт у Адрынках. Дзейнасць архімандрыта Гаўрыіла.
**13.45** «Палескі пачастунак». Кулага і фаршыраваная бульба.
**14.00 «Дэбют». Маст. фільм.**
**14.35** «Лабірынты». Першадрукар Іван Фёдараў.
**15.15** «Вялікай Перамогі салдаты». Дак. фільм.
**15.45** «Цуды прыроды». Шатландыя. Байкал. Андалузія.
**16.10** «У рэху імені твайго...». Пра жонку Васіля III Алену Глінскую.
**16.30** «Любоў і жыццё маё...». Дак. фільм.
**17.15** «Зроблена!». Кінавытворчасць.
**17.45** «Падарожжа са смакам». Барселона.
**18.15** «Наша спадчына». Пахавальня ў Суботніках.
**18.30 «Высокая кроў». Маст. фільм.**
**20.00 Серыял «Залатое цяля». 1-я серыя.**
**20.45** Калыханка.
**22.30 «Памылка інжынера Кочына». Маст. фільм.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Тотэнхэм» — «Арсенал».
**10.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Манчэстэр Юнайтэд» — «Ліверпуль».
**11.55** Тэніс. Турнір ВТА. Індыян-Уэлс. Фінал.
**14.00** Футбол. Суперкубак Беларусі. БАТЭ — ФК Мінск.
**15.50** Алімпійскія гульні. Сочы-2014. Біятлон. Гонка з масавым стартам. Жанчыны.
**16.50** Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Трыумф».
**18.30** Хакей. КХЛ. Плэй-оф.
**20.55** Авертайм.
**21.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**22.20** Алімпійскія гульні. Сочы-2014. Фрыстайл. Акрабатыка. Фінал. Мужчыны.
**23.20** Алімпійскія гульні. Сочы-2014. Фігурнае катанне. Вольная праграма. Жанчыны.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здорава!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «У наш час».
**12.05** «Яны і мы».
**13.10** «Добрага здаровейка!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15** «Зразумець. Дараваць».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік». «1863-і. Пад ударам імперыі». Фільм другі.
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** Ток-шоу «Пазіцыя».
**22.05** Канцэрт беларускіх удзельнікаў тэлепраекта «Голас».
**23.35 Маст. фільм «Востраў».**
**1.30** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.45** «Вялікае снеданне».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.40** «Такі лёс».
**12.30** «Сямейныя драмы».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** «Зорны рынг. Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў». «Скай Тай» супраць «Sun Road 21».
**15.45** «Глядзець усім!».
**16.15** «Наша справа».
**16.50** «Следакі».
**18.30** «Ежа багоў».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Маст. фільм «Прызнайце мяне вінаватым».**
**23.00** «Ваенная тайна».

### МІР

**5.00** «180 хвілін».
**7.15, 23.10** Беларусь сёння.
**8.15 Маст. фільм «Дні хірурга Мішкіна».**
**12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**12.20 Серыял «Чужыя памылкі».**
**14.05** Дак. фільм «У свеце каменных джунгляў».
**15.20, 23.35** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.10, 3.25 Серыял «Монтэкрыста».**
**18.20 Серыял «Маўклівы сведка».**
**21.20 Серыял «Чорны крумкач».**
**0.25** «Агульны інтарэс».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Прамы эфір».
**12.45 Серыял «Чужы твар».**
**13.50, 16.50, 19.50, 0.25** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Дыялог са смерцю. Перагаворшчыкі».
**15.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**17.10 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**18.05 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».**
**18.55 Серыял «Блудныя дзеці».**
**20.45 Серыял «Ластаўчына гняздо».**
**21.45 Серыял «Там, дзе ты».**
**0.35** «Сакрэтныя матэрыялы: ключы ад даўгалецця».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.40** «Новыя рускія сенсацыі».
**9.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.10** «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.35 Баявік «Круты».**
**21.20 Маст. фільм «У тваіх вачах».**
**23.10** Сёння. Вынікі.
**23.35 Серыял «Дзікі».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.50, 19.05, 20.55, 23.50** «Надвор'е».
**7.05** М/ф.
**8.30, 14.40** «Тэлемагазін».
**9.00 Серыял «Ведзьмы з Іст-Энда».**
**11.15 Камедыя «Іван Васільевіч мяняе прафесію».**
**12.55 Фантастка «Паралельная рэчаіснасць».**
**14.30** «Кінаблакнот».
**15.10 Серыял «Тайны Ніра Вульфа».**
**16.10** Мультпарад.
**16.30** «Мой любімы гадавалец».
**17.00 Серыял «Тэорыя хлусні».**
**17.55 Серыял «Служба навін».**
**19.10 Серыял «Тайныя сувязі».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Трылер «Вавілон новай эры».**
**22.50 Серыял «Спартак. Вайна праклятых».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 19.00 Серыял «Святлафор».**
**10.00** «Яда па правілах і без».
**11.00** « Жонкі алігархаў».
**12.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**13.00, 23.20** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.00** Скетч-шоу «Валера-ТБ».
**15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**16.00 Баявік «Сахара».**
**18.30, 0.00** «Лаві момант».
**20.00 Серыял «Кухня».**
**21.10 Камедыя «Сямейны план».**

### КУЛЬТУРА

**6.00** «Еўраньюс».
**9.00, 14.00, 18.00, 22.30** Навіны культуры.
**9.15, 0.40** «Наглядальнік».
**10.15 «Пэры Мэйсан». Серыял.**
**11.10** «Лінія жыцця». Гарык Сукачоў.
**12.10** «Вялікае вяселле Фаізы». Дак. фільм.
**13.00** «Карл Фрыдрых Гаус». Дак. фільм.
**13.10 «У лясах і на гарах». Серыял.**
**14.10 «Бераг». Маст. фільм.**
**16.25** «Ціхі геній. Аляксандр Папоў». Дак. фільм.
**17.10** Academia.
**18.15** Галоўная роля.
**18.30** «Саці. Нясумная класіка...».
**19.10** «Правілы жыцця».
**19.40** «Астравы». Рымас Тумінас.
**20.20** «Тым часам».
**21.05** Прыступкі цывілізацыі. «Першы камп'ютар свету». Дак. фільм.
**22.00** «Сялянская гісторыя». Дак. серыял. Фільм 1-ы.
**22.50** «Кінескоп». «Ратэрдамскі кінафестываль».
**23.30** «Дом Марыны». Дак. фільм.
**0.25** «Сусветныя скарбы культуры».
**1.35** Рыхард Штраус. Сімфанічная паэма «Дон Жуан».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «СевАлогія». «Забароненая музыка».
**6.00, 17.45** Канцэрт замежнай эстрады.
**6.20** «КВЗ». Сустрэча каманд МИСИ — ВИСИ. Сезон 1986-1987 гг.
**7.50** «Падарожжа падчас канцэрта». Канцэртная праграма з удзелам Джані Марандзі. 1983 год.
**9.00 «Эксперымент». Камедыя.**
**10.25** «Аўтограф па суботах». 1993 год.
**11.00** «Спяем, сябры!». 1974 год.
**12.00, 3.00** «Колба часу».
**13.00** «Блакітны агеньчык». 1963 год.
**14.00** «Спявае Адрыяна Чэлентана». Фільм-канцэрт. 1987 год.
**16.15** «Адзін за ўсіх!». Фільм-бенефіс М. Карачанцава. 1985 год.
**17.00** «... Да 16 і старэйшым». 1991 год.
**18.05** «Старты для ўсіх». Дак. фільм.
**18.30** «Усё пра Еву». 1 частка. Фільм-спектакль. 1990 год.
**20.00, 2.00** «Мінулы час» .
**21.00** «Народжаны ў СССР».
**22.00** «Салют, фестываль!». Тэлемост Масква — Гавана. 1985 год. 1 частка.
**23.00** «Рок і вакол яго». Тэлемост Масква — Ленінград. 1987 год.
**0.00** «Нью-Ёрк, Нью-Ёрк». 1995 год.
**0.40 «Шлях да сябе». Маст. фільм.**
**4.00** «Кінапанарама». 1987 год.

### EUROSPORT

**10.30, 15.00, 1.30** Веласпорт.
**11.15, 18.15** Футбол. Кубак свету (U-17).
**12.00, 0.30** Біятлон. Кубак свету.
**13.00, 22.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Чэмпіянат свету FIS па палётах на лыжах.
**14.00** Лыжныя гонкі.
**19.30, 2.30** Футбол. Еўрагалы.
**20.30** Снукер. Хайку Уорлд Оўпен Кітай. Фінал.
**22.45** All sports.
**23.00** Пра рэслінг.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 8.00, 12.55, 16.00, 21.00, 2.20** Серыял «Камп'ютаршчыкі».
**6.15** Камедыя «Два калядныя сабакі».
**7.45, 8.45, 10.35, 13.50, 16.45, 21.55, 23.50, 1.50, 3.05** «Камедыянты. Лепшае».
**9.00** Камедыя «Бязлітасныя людзі».
**11.15** Камедыя «Помста пушыстых».
**14.10** Камедыя «Сверб сёмага года».
**17.20** Камедыя «Ажанюся з першай сустрэчнай».
**19.20** Камедыя «Мадам Ірма».
**22.10** Камедыя «Аперацыя «Святы Януарый».
**0.10** Баявік «Кілеры».
**3.25** Камедыя «Яго дзяўчына Пятніца».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.05** «Сардэчна запрашаем дадому!».
**8.45, 18.30, 3.00** «Забароненае каханне». Тэлесерыял.
**10.15** «Паненка і кулінар».
**10.45, 17.00** «Паралельны свет». Дак. серыял.
**11.45, 16.00** «Варажбітка». Дак. серыял.
**12.45, 18.00** «Паляўнічыя на прывідаў». Дак. серыял.
**13.10** «Жонка. Гісторыя кахання». Галіна Волчак.
**14.30** «Сто пытанняў даросламу». Мікалай Драздоў.
**15.15, 0.00, 5.20** «Звышнатуральнае». Серыял.
**20.20** «Леднікаў». Серыял.
**21.20, 4.30** «Гібель імперыі». Серыял.
**22.30** «Спадарожнік». Маст. фільм.
**0.45** «Абрынутыя нябёсы». Серыял.
**1.30** «Часова даступны». Ірына Алеграва.
**2.20** «Без падману».

### ТБ1000

**5.00** Баявік «Чалавек-павук 3».
**7.25** Камедыя «Рэчаіснасць кусаецца».
**9.10** Трагікамедыя «Жыццё цудоўнае».
**11.00** Камедыя «Круты і цыпачкі».
**13.00** Драма «Чарадзейная краіна».
**15.15** Драма «Я спакусіла Эндзі Уорхала».
**16.45** Трылер «Прывід».
**19.00** Драма «Паляўнічы».
**20.45** Трылер «Крумкач».
**22.45** Трагікамедыя «Кірмаш ганарыстасці».
**1.15** Меладрама «Спяшайся кахаць».
**3.05** Драма «Гульні страсці».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Дэтэктыў «Смерць пад ветразем».
**8.00** Меладрама «Вольнае плаванне».
**10.00** Драма «Агні прытона».
**12.00** Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана: Скарбы Агры».
**14.50** Меладрама «Толькі не сыходзь...».
**16.20** Камедыя «2 дні».
**18.00** Меладрама «Кантракт на каханне».
**20.00** Меладрама «Мегаполіс».
**22.00** Камедыя «Самы лепшы фільм 3-ДЭ».
**0.00** Фэнтэзі «Цёмны свет».
**2.00** Камедыя «Каўчэг».
**4.00** Драма «Урокі ў канцы вясны».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 21.00, 1.00, 4.00** Сканеры старажытнага свету.
**6.00** Супердрапежнікі.
**7.00, 16.00** Злавіць сома.
**8.00, 13.00, 20.00** З пункту гледжання навукі.
**9.00, 14.00, 18.00, 22.00, 0.00, 3.00** Космас.
**10.00** Аўта-SOS.
**11.00** Страчаныя скарбы Амерыкі.
**12.00** Золата горада-прывіда.
**15.00** Дзікая прырода Расіі.
**17.00, 2.00** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**23.00** Расследаванні авіякатастроф.

### DISCOVERY

**7.00** Майстэрня «Фантом Уоркс».
**7.50, 12.20, 22.00** Сысці ад пагоні.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35** Скарбашукальнікі Амерыкі 2.
**10.30, 0.55** Top Gear.
**11.25** Не спрабуйце паўтарыць.
**13.15, 16.25, 6.05** Махінатары.
**14.10, 3.55** Хуткія і гучныя.
**15.05** Беар Грылс: выбрацца жывым.
**16.00** Пятая перадача.
**17.20, 3.05** Паляўнічыя на рэліквіі.
**18.15** Будучыня.
**19.10** Гіганцкія самалёты.
**21.00** Гульня на жыцці.
**23.00** Хлопцы з Юкана.
**0.00** Кландайк.
**1.50** Сапраўдныя аферысты.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.
**5.10** Цуды Сусвету.

# АЎТОРАК, 18 САКАВІКА

## БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.40** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.20** Зона X.
**9.10, 15.25 Серыял «Дыхай са мной».**
**11.00, 20.00 Серыял «Ластаўчына гняздо».**
**11.55** «Славянскі базар у Віцебску-2014». Нацыянальны адбор.
**12.10, 1.10** Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
**13.05, 21.45 Серыял «Фурцава».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.30** Беларуская часінка.
**19.20, 0.00** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**0.55** Дзень спорту.

## БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Цені мінулага».**
**10.10** Беларуская кухня.
**10.50, 0.40 Серыял «Людзі Шпака».**
**11.55, 18.55 Дэтэктыў «Гульня на выбыванне».**
**13.50** «Пад грыфам «Вядомыя».
**14.25, 21.30 Серыял «Універ. Новы інтэрнат».**
**16.00** Вышэй за дах.
**16.30** «Імперыя песні». На біс.
**17.05** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**20.50** Рэальны свет.
**21.25** КЕНО.
**22.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. «Рэал» (Мадрыд) — «Шальке-04».

## БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабранарак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.35, 15.00, 17.00, 21.05, 0.05** «Калейдаскоп».
**8.05, 12.45, 15.05, 17.05, 0.15** «Энцыклапедыя беларускага спорту». Кулявая стральба.
**8.15, 20.00 Серыял «Залатое цяля».**
**9.00, 22.00** «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
**9.30 Серыял «Мегрэ».**
**10.25, 23.40** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака Віктара Ганчарэнкі.
**10.50, 14.20, 16.35, 19.50** «Размаўляем па-беларуску».
**10.55 «Памылка інжынера Кочына». Маст. фільм.**
**12.55** «Плошча мастацтваў». Актрыса Тамара Нікалаева.
**13.20** «Падарожжа са смакам». Мальта і Гоза.
**13.55** «Наша спадчына». Жалудоцкі палац.
**14.25** «Адлюстраванні». Францішка Урсула Радзівіл.
**14.45 «Кавалеры рэк, балот і лясоў». Навукова-папулярны фільм.**
**15.15** «Карані». Канстанцін Грамыка — беларус, які жыве ў Санкт-Пецярбургу.
**15.45** «Шчасце Алены». Дак. фільм.
**16.05** «Скарбніца Магілёўшчыны». Палац Пацёмкіна.
**16.40** «Імгненне вечнасці». Перакладчыца, паэтэса Надзея Вольпін і Сяргей Ясенін.
**17.15** «Цуды прыроды». Вялікабрытанія. Казахстан. Кітай. Чэхія.
**17.45** «Настальжы». Кампазітар Людміла Шлег.
**18.10** «Глыбокае». Дак. фільм.
**18.20 «Дзед Аўсей і Палашка». Маст. фільм.**
**18.45** «Палескі пачастунак». Палюхі тварожныя.
**18.55** «Струны прасторы і часу». Дак. фільм.
**19.25** «Добры дзень, мае дарагія!».
**20.45** Калыханка.
**22.30 «Песня пра зубра». Маст. фільм.**

## БЕЛАРУСЬ 5

**8.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**9.00** Авертайм.
**9.25** Хакей. КХЛ. Плэй-оф.
**11.20** Алімпійскія гульні. Сочы-2014. Лыжны спорт. Спрынт. Фінал. Мужчыны. Жанчыны.
**13.10** Алімпійскія гульні. Сочы-2014. Снаўборд. Хафпайп. Фінал. Жанчыны.
**14.25** Алімпійскія гульні. Сочы-2014. Канькабежны спорт. 1500 м. Мужчыны.
**16.10** Біятлон. Кубак свету. Канціялахці. Спрынт. Жанчыны.
**17.25** Спорт-кадр.
**17.55** Гандбол. SEHA-ліга. БГК ім. Мяшкова (Беларусь) — «Партызан» (Сербія).
**19.30** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. 1/2 фіналу. «Металург» (Жлобін) — «Нёман» (Гродна).
**21.55** Час футбола. Прэв'ю да матчаў Лігі чэмпіёнаў.
**22.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА . 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Чэлсі» (Англія) — «Галатасарай» (Турцыя).
**0.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА . 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Рэал Мадрыд» (Іспанія) — «Шальке-04» (Германія).

## АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «У наш час».
**12.05** «Яны і мы».
**13.10** «Добрага здаровейка!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15** «Зразумець. Дараваць».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Смешнае і яшчэ смяшнейшае».
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Дрэнная кроў».**
**23.20 Маст. фільм «З пекла».**
**1.20—1.50** Начныя навіны.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**9.00** «Ежа багоў».
**10.00** «100 працэнтаў».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35 «Вовачка 3». Серыял.**
**12.05** «Сямейныя драмы».
**13.00** «Цэнтральны рэгіён».
**13.50 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе».**
**15.30** «Не хлусі мне!».
**16.50** «Следакі».
**18.30** «Вам і не снілася»: «Тайна нараджэння».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Маст. фільм «Барсаліна».**
**23.00** «Разумней не прыдумаеш».
**23.55** «Аўтапанарама».
**0.15 Маст. фільм «Кармэн».**

## МІР

**10.00, 0.25 Маст. фільм «Алмазы для Марыі».**
**11.30** «Зроблена ў СССР».
**12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**12.20 Серыял «Чужыя памылкі».**
**14.05** Дак. фільм «Эпоха. Падзеі і людзі».
**15.20, 23.35** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.10, 3.25 Серыял «Монтэкрыста».**
**18.20 Серыял «Маўклівы сведка».**
**21.20 Серыял «Чорны крумкач».**
**23.05, 4.25** «Саюзнікі».
**1.45 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Асаблівы выпадак».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Прамы эфір».
**12.45 Серыял «Чужы твар».**
**13.50, 16.50, 19.50, 0.25** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Зніклая субмарына. Трагедыя К-129».
**15.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**17.10 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**18.05 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».**
**18.55 Серыял «Блудныя дзеці».**
**20.45 Серыял «Ластаўчына гняздо».**
**21.45 Серыял «Там, дзе ты».**
**0.35** «Спецыяльны карэспандэнт».

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.45, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.10** «Справа густу».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Марскія д'яблы».**
**23.10 Сёння. Вынікі.**
**23.35 Серыял «Дзікі».**

## 8 КАНАЛ

**7.00, 12.30, 19.05, 20.55, 0.05** «Надвор'е».
**7.05, 16.05** Мультпарад.
**7.30 Маст. фільм «Граф Монтэ Крыста», 1-я серыя.**
**09.25, 17.55 Серыял «Служба навін».**
**10.30** «Сёння клюе».
**11.00, 19.10 Серыял «Тайныя сувязі».**
**12.35 Трылер «Адвакат д'ябла».**
**15.10 Серыял «Тайны Ніра Вульфа».**
**16.30** «Золата маўчання».
**17.00 Серыял «Тэорыя хлусні».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Камедыя «Інтуіцыя».**
**22.40** Ток-шоу «Бульбокс».
**23.10 Серыял «Спартак. Вайна праклятых».**

## ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 18.15, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 19.00 Серыял «Святлафор».**
**10.00** «Гардэроб на вылет».
**11.00** «Жонкі алігархаў».
**12.00, 20.00 Серыял «Кухня».**
**13.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**14.00, 23.20** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**16.00 Камедыя «Сямейны план».**
**18.30, 0.00** «Лаві момант».
**21.10 Камедыя «Добры хлопец».**

## КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00, 14.00, 18.00, 22.30** Навіны культуры.
**9.15, 0.55** «Наглядальнік».
**10.15 «Пэры Мэйсан». Серыял.**
**11.10, 19.10** «Правілы жыцця».
**11.40** «Пятае вымярэнне».
**12.10** «Першы камп'ютар свету». Дак. фільм.
**13.05** «Фідый». Дак. фільм.
**13.10 «У лясах і на гарах». Серыял.**
**14.10, 22.50 «Аліса ў краіне цудаў». Маст. фільм.**
**15.25** «Астравы». Рымас Тумінас.
**16.05** Майстры фартэпіяннага мастацтва.
**16.55** «Сусветныя скарбы культуры».
**17.10** Academia.
**18.15** Галоўная роля.
**18.30** Улада факта.
**19.40** «Больш чым каханне». Аляксандр і Людміла Пяцігорскія.
**20.25** «Гульня ў бісер».
**21.05** Прыступкі цывілізацыі. «Свет, закінуты ў акіяне». Дак. фільм.
**22.00** «Сялянская гісторыя». Дак. серыял.
**0.10** П.І. Чайкоўскі. «Поры года».
**0.50** «Стэндаль». Дак. фільм.

## НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Спяем, сябры!». 1974 год.
**6.00, 15.00, 21.00** «Народжаныя ў СССР».
**7.00** «Блакітны агеньчык». 1963 год.
**8.00** «Спявае Адрыяна Чэлентана». Фільм-канцэрт. 1987 год.
**10.15** «Адзін за ўсіх!». Фільм-бенефіс М. Карачанцава. 1985 год.
**11.00** «... Да 16 і старэйшым». 1991 год.
**11.45, 0.00** Канцэрт замежнай эстрады.
**12.05** «Старты для ўсіх». Дак. фільм.
**12.30, 18.30** «Усё пра Еву». Фільм-спектакль. 1990 год.
**14.00, 20.00** «Мінулы час» .
**16.00, 22.00** «Салют, фестываль!». Тэлемост Масква — Гавана. 1985 год.
**17.00** «Спяем, сябры!». 2005 год.
**18.05** «Знак пытання». 1994 год.
**19.45** «Добрай ночы, малыя». «Як я перастаў хлусіць». 1990 год.
**23.00** «СевАлогія». «Забароненая музыка».
**0.20** «КВЗ». Сустрэча каманд МИСИ — ВИСИ. Сезон 1986-1987 гг.
**1.50** «Падарожжа падчас канцэрта». Канцэртная праграма з удзелам Джані Марандзі. 1983 год.
**3.00 «Эксперымент». Камедыя.**
**4.25** «Аўтограф па суботах». 1993 год.

## EUROSPORT

**10.30, 13.30, 18.45** Футбол. Еўрагалы.
**11.30** Футбол. 1/4 фіналу. ПСЖ (Францыя) — «Рэал Мадрыд» (Іспанія).
**12.30, 15.15** Веласпорт.
**14.30, 18.15** All sports.
**19.45** Футбол. 1/4 фіналу. «Барселона» (Іспанія) — «Арсенал» (Англія).
**22.00** Бокс. Чэмпіянат свету па версіі WBA. A. Mansour (ЗША) — K. Price (ЗША).
**23.30** Бокс. Ю. Брэмер (Германія) — M. Oliviera (ЗША).
**0.45** Футбол. Кубак свету (U-17).

## КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 8.00, 12.55, 16.00, 21.00, 2.20** Серыял «Камп'ютаршчыкі».
**6.00, 7.45, 8.45, 10.40, 13.50, 21.55, 23.50, 1.45, 2.45** «Камедыянты. Лепшае».
**6.15** Камедыя «Помста пушыстых».
**9.00** Камедыя «Сверб сёмага года».
**11.15** Камедыя «Ажанюся з першай сустрэчнай».
**14.10** Камедыя «Аперацыя «Святы Януарый».
**17.20** Камедыя «Мадам Ірма».
**19.15** Камедыя «Паміж анёлам і чортам».
**22.10** Камедыя «Мамчын сынок».
**0.10** Камедыя «Бязлітасныя людзі».
***3.00 — Прафілактыка***

## ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.30, 14.45, 2.30** «Доктар І..».
**9.00, 18.30, 3.00** «Забароненае каханне». Тэлесерыял.
**10.30, 17.00** «Паралельны свет». Дак. серыял.
**11.30, 16.00** «Варажбітка». Дак. серыял.
**12.30, 18.00** «Паляўнічыя на прывідаў». Дак. серыял.
**13.00, 20.20** «Леднікаў». Серыял.
**13.50, 1.40** «Дом дагары нагамі».
**15.15, 0.10, 5.20** «Звышнатуральнае». Серыял.
**21.20, 4.30** «Гібель імперыі». Серыял.
**22.30** «Дробныя махляры». Маст. фільм.
**0.55** «Абрынутыя нябёсы». Серыял. Заключная серыя.

## ТБ1000

**5.00** Камедыя «Рэчаіснасць кусаецца».
**7.00** Камедыя «Круты і цыпачкі».
**9.00** Камедыя «У Міні гэта ў першы раз».
**11.00** Драма «Зрабі крок».
**13.00** Трылер «Прывід».
**15.15** Драма «Паляўнічы».
**17.00** Трылер «Крумкач».
**19.00** Баявік «Прывідны гоншчык 2».
**20.45** Драма «Гульні страсці».
**22.20** Драма «Баец».
**0.30** Фільм жахаў «Хаціна ў лесе».
**2.30** Камедыя «Калі свякроў — монстр».

## ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Меладрама «Толькі не сыходзь...».
**8.00** Меладрама «Кантракт на каханне».
**10.00** Камедыя «Каўчэг».
**12.00** Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана».
**14.00** Камедыя «Самы лепшы фільм 3-ДЭ».
**16.00** Меладрама «Мегаполіс».
**18.00** Камедыя «Іронія лёсу. Працяг».
**20.00** Фэнтэзі «Казка. Ёсць».
**22.00** Камедыя «Наша Russia. Яйкі лёсу».
**23.40** Драма «Урокі ў канцы вясны».
**1.30** Драма «Ікона сезона».
**3.10** Драма «лісты да Эльзы».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 21.00, 1.00, 4.00** Займальная навука.
**6.00** Супердрапежнікі.
**7.00** Злавіць сома.
**8.00, 13.00** Космас.
**9.00, 14.00** Сканеры старажытнага свету.
**11.00** Страчаныя скарбы Амерыкі.
**12.00** Золата горада-прывіда.
**15.00** Дзікая прырода Расіі.
**16.00** Гісторыя жывёльнага свету.
**17.00, 2.00** Вялікія ўцёкі.
**18.00** Скарбашукальнікі.
**19.00** Прыроджаны байкер.
**20.00, 0.00, 3.00** Гульні розуму.
**22.00** Дзікі тунец.
**23.00** Расследаванні авіякатастроф.

## DISCOVERY

**7.00, 21.00** Хуткія і гучныя.
**7.50, 12.20, 22.00** Беар Грылс: выбрацца жывым.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35** Паляўнічыя на рэліквіі.
**10.30, 0.55** Top Gear.
**11.25** Цуды Сусвету.
**13.15, 16.25, 6.05** Махінатары.
**14.10, 16.00, 3.55** Пятая перадача.
**15.05** Выжыць разам.
**17.20, 3.05** Багажныя войны.
**18.15** Сысці ад пагоні.
**19.10** Гульня на жыццё.
**22.00** Акулы аўтатаргоў з Даласа.
**23.00** Мотарэстаўрацыя.
**0.00, 5.10** Адваротны бок хаосу.
**1.50** Сапраўдныя аферысты.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

# СЕРАДА, 19 САКАВІКА

## БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.10** Зона X.
**8.50** Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на Дзень Святога Іосіфа, абручніка Дзевы Марыі.
**9.10, 15.25 Серыял «Дыхай са мной».**
**11.00, 20.00 Серыял «Ластаўчына гняздо».**
**11.55** «Славянскі базар у Віцебску-2014». Нацыянальны адбор.
**12.10, 0.55** Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
**13.05, 21.45 Серыял «Фурцава».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.30** Беларуская часінка.
**19.20** Спецыяльны рэпартаж.
**21.00** Панарама.
**23.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.45** Дзень спорту.

## БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Цені мінулага».**
**10.10** Заўтра — гэта мы!
**10.40, 1.10 Серыял «Людзі Шпака».**
**11.50, 19.00 Дэтэктыў «Гульня на выбыванне».**
**13.45** «Пад грыфам «Вядомыя».
**14.40, 21.35 Серыял «Універ. Новы інтэрнат».**
**15.50** Рэпарцёр.
**16.40** «На шляху да чэмпіянату свету па футболе 2014». Відэачасопіс.
**17.10** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**21.25** «Спортлато 5 з 36».
**21.30** КЕНО.
**22.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. «Барусія» (Дортмунд) — «Зеніт».
**0.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд 2-х гульнявых дзён.

## БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабранарак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.15, 15.00, 16.55, 21.05, 0.20** «Калейдаскоп».
**8.05, 12.20, 15.10, 17.05, 0.25** «Энцыклапедыя беларускага спорту». Плаванне.
**8.15, 12.30, 15.20, 17.15** «Размовы пра духоўнае».
**8.25, 20.00 Серыял «Залатое цяля».**
**9.15, 22.05** «Знакі лёсу. Віктар Казько». Дак. фільм.
**9.45, 21.10 Серыял «Мегрэ».**
**10.35, 23.50** «Святло далёкай зоркі». Памяці заслужанай артысткі БССР Ганны Рыжковай.
**11.00, 14.25, 16.25, 19.55** «Размаўляем па-беларуску».
**11.05 «Песня пра зубра». Маст. фільм.**
**12.40** «Плошча мастацтваў». Кампазітар Андрэй Мдзівані.
**13.10** «Цуды прыроды». Лапландыя. Альпы. Францыя. Гібралтар.
**13.40** «У рэху імені твайго...». Пра жыццё жонкі князя Міндоўга — Марты.
**13.50** «Востраў». Дак. фільм.
**14.10** «Музеум». Выданні Скарыны.
**14.30** «Эцьен. Вяртанне». Дак. фільм.
**15.30** «Падарожжа са смакам». Францыя.
**16.00** «Наша спадчына». Палац у Дзятлаве.
**16.30** «Творцы». Народны артыст Беларусі, рэжысёр Канстанцін Саннікаў.
**17.25** «Адкрыццё». Пісьменнік Алесь Адамовіч.
**17.50** «Палескі пачастунак». Пірог са шчаўем і запечаны шчупак.
**18.05** «Карані». Музей у Скарышэва.
**18.30 «Госць». Маст. фільм.**
**19.00** «Магія дрэва». Навукова-папулярны фільм.
**19.15** «Скарбніца Берасцейшчыны». Дагукацца да нябёсаў. Камянецкая вежа.
**19.40** «Росчырк часу». Фотамастак Мірон Шчудло.
**20.45** Калыханка.
**22.35 «Нашы суседзі». Маст. фільм.**

## БЕЛАРУСЬ 5

**8.10** Спорт-кадр.
**8.40, 18.55** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. 1/2 фіналу. «Металург» (Жлобін) — «Нёман» (Гродна).
**10.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА . 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Чэлсі» (Англія) — «Галатасарай» (Турцыя).
**12.25** Гандбол. SEHA-ліга. БГК ім. Мяшкова (Беларусь) — «Партызан» (Сербія).
**13.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА . 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Рэал Мадрыд» (Іспанія) — «Шальке-04» (Германія).
**15.45** Алімпійскія гульні. Сочы-2014. Лыжны спорт. Эстафета 4х10 км. Мужчыны.
**17.30** Біятлон. Кубак свету. Паклюка. Спрынт. Жанчыны.
**21.15** Алімпійскія гульні. Сочы-2014. Фрыстайл. Акрабатыка. Фінал. Жанчыны.
**21.55** Час футбола. Прэв'ю да матчаў Лігі чэмпіёнаў.
**22.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Манчэстэр Юнайтэд» (Англія) — «Алімпіякас» (Грэцыя).
**0.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Барусія Дортмунд» (Германія) — «Зеніт» (Расія).

## АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «У наш час».
**12.05** «Яны і мы».
**13.10** «Добрага здаровейка!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15** «Зразумець. Дараваць».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Смешнае і яшчэ смяшнейшае».
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Дрэнная кроў».**
**23.20 Баявік «Егер».**
**1.10** Начныя навіны.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**9.00, 18.30** «Вам і не снілася»: «Тайна нараджэння».
**10.05** «Аўтапанарама».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35 «Вовачка 3». Серыял.**
**12.05** «Сямейныя драмы».
**13.00** «Мінск і мінчане».
**13.50 Маст. фільм «Барсаліна».**
**16.05** «Уявіце сабе».
**16.50** «Следакі».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Меладрама «Даруй за каханне».**
**23.00** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**23.55** «Скардзіцца дазваляецца».
**0.15 Маст. фільм «Белы ікол».**

## МІР

**5.00** «180 хвілін».
**8.15, 18.20 Серыял «Маўклівы сведка».**
**10.00, 0.25 Маст. фільм «Горад прыняў».**
**11.30** «Любімыя акцёры».
**12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**12.20 Серыял «Чужыя памылкі».**
**14.05** Дак. фільм «У свеце мінулага».
**15.20, 23.35** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.10, 3.25 Серыял «Монтэкрыста».**
**21.20 Серыял «Пастка».**
**23.05, 4.25** «Сакрэтныя матэрыялы».
**1.50 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Асаблівы выпадак».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Прамы эфір».
**12.45 Серыял «Чужы твар».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.40** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Шум зямлі».
**15.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**17.10 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**18.05 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».**
**18.55 Серыял «Блудныя дзеці».**
**20.45 Серыял «Ластаўчына гняздо».**
**21.45 Серыял «Там, дзе ты».**
**23.50 Серыял «Тайны следства».**
**0.40** «Тайна трох акіянаў».

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.45, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.15** «Справа густу».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.35 Серыял «Марскія д'яблы».**
**23.10** Сёння. Вынікі.
**23.35 Маст. фільм «Мой дом — мая крэпасць».**

## 8 КАНАЛ

**7.00, 12.30, 19.05, 20.55, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.05** Мультпарад.
**7.30 Маст. фільм «Граф Монтэ Крыста», 2-я серыя.**
**9.10** «Кінаблакнот».
**9.25, 17.55 Серыял «Служба навін».**
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00, 19.10 Серыял «Тайныя сувязі».**
**12.35 Камедыя «13 сяброў Оўшэна».**
**14.50, 16.40** «Тэлемагазін».
**15.10 Серыял «Тайны Ніра Вульфа».**
**16.25** «Золата маўчання».
**17.00 Серыял «Тэорыя хлусні».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Драма «Белы александр».**
**23.00 Серыял «Спартак. Вайна праклятых».**

## ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 18.15, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 19.00 Серыял «Святлафор».**
**10.00** «Гардэроб на вылет».
**11.00** «Жонкі алігархаў».
**12.00, 20.00 Серыял «Кухня».**
**13.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**14.00, 23.20** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**16.00 Камедыя «Добры хлопец».**
**18.30, 0.00** «Лаві момант».
**21.10 Прыгоды «Зыходнае становішча».**

## КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00, 14.00, 18.00, 22.30** Навіны культуры.
**9.15, 0.55** «Наглядальнік».
**10.15 «Пэры Мэйсан». Серыял.**
**11.10, 19.10** «Правілы жыцця».
**11.40** «Правінцыйныя музеі Расіі». Зарайск.
**12.05** «Свет, закінуты ў акіяне». Дак. фільм.
**12.55** Важныя рэчы. «Гадзіннік Меншыкава».
**13.10 «У лясах і на гарах». Серыял.**
**14.10, 22.50 «Прыгоды барона Мюнхгаўзена». Маст. фільм.**
**16.10** Майстры фартэпіяннага мастацтва. Элісо Вірсаладзэ.
**16.55, 20.05** «Сусветныя скарбы культуры».
**17.10** Academia.
**18.15** Галоўная роля.
**18.30** «Абсалютны слых».
**19.40** «Геніі і зладзеі». Анатоль Луначарскі.
**20.20** «Вадзім Фісон. Чалавек з неабмежаванымі магчымасцямі». Дак. фільм.
**21.05** Прыступкі цывілізацыі. «Метэарытная пагроза». Дак. фільм.
**22.00** «Сялянская гісторыя». Дак. серыял.
**0.50** «Каміль Каро». Дак. фільм.

## НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «... Да 16 і старэйшым». 1991 год.
**5.45** Канцэрт замежнай эстрады.
**6.05** «Старты для ўсіх». Дак. фільм.
**6.30, 12.30** «Усё пра Еву». Фільм-спектакль. 1990 год.
**8.00, 14.00, 20.00** «Мінулы час» .
**9.00, 15.00, 21.00, 0.00** «Народжаныя ў СССР».
**10.00, 16.00** «Салют, фестываль!». Тэлемост Масква — Гавана. 1985 год.
**11.00** «Спяем, сябры!». 2005 год.
**12.05** «Знак пытання». 1994 год.
**13.45** «Добрай ночы, малыя». «Як я перастаў хлусіць». 1990 год.
**17.00** «Усур'ёз і надоўга». Дак. фільм.
**18.00** «Бліц». 1990 год.
**18.35 «Дні хірурга Мішкіна». 1-я серыя. Маст. фільм.**
**22.00** «Дзесяць цяжкіх дарог... Дзесяць гадоў на сцэне». 1992 год. 1 частка.
**23.00** «Спяем, сябры». 1974 год.
**1.00** «Блакітны агеньчык». 1963 год.
**2.00** «Спявае Адрыяна Чэлентана». Фільм-канцэрт. 1987 год.
**4.15** «Адзін за ўсіх!». Фільм-бенефіс М. Карачанцава. 1985 год.

## EUROSPORT

**10.35, 18.00, 0.45** Футбол. Кубак свету (U-17).
**11.30, 19.00** Футбол. 1/4 фіналу. «Барселона» (Іспанія) — «Арсенал» (Англія).
**12.30, 15.00** Веласпорт.
**13.30** Снукер. Хайку Уорлд Оўпен Кітай. Фінал.
**16.00, 20.00** Біятлон. Кубак свету.
**17.00, 21.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Чэмпіянат свету FIS па палётах на лыжах.
**17.45** Зімнія віды спорту. Скі-пас.
**22.00, 0.40** Выбранае па серадах.
**22.05** Конны спорт.
**23.10** All sports.
**23.15** Гольф. Еўрапейскі тур.
**0.00** Парусны спорт.
**0.35** Гольф-клуб.

## КАМЕДЫЯ

**9.00** Камедыя «Аперацыя «Святы Януарый».
**10.40, 13.50, 15.45, 20.45, 21.50, 23.50, 1.50, 3.10** «Камедыянты. Лепшае».
**10.55, 16.55, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**11.15** Камедыя «Мадам Ірма».
**12.55, 16.00, 21.00, 2.20** Серыял «Камп'ютаршчыкі».
**14.10** Камедыя «Мамчын сынок».
**17.10** Камедыя «Паміж анёлам і чортам».
**19.20** Камедыя «Кватарант».
**22.10** Камедыя «Цёрнер і Хуч».
**0.10** Камедыя «Сверб сёмага года».
**3.25** Камедыя «Помста пушыстых».

## ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.30, 14.45, 2.30** «Доктар І..».
**9.00, 18.30, 3.15** «Забароненае каханне». Тэлесерыял.
**10.30, 17.00** «Паралельны свет». Дак. серыял.
**11.30, 16.00** «Варажбітка». Дак. серыял.
**12.30, 18.00** «Паляўнічыя на прывідаў». Дак. серыял.
**13.00, 20.20** «Леднікаў». Серыял.
**13.50, 2.20** «Дом дагары нагамі».
**15.15, 0.30** «Звышнатуральнае». Серыял.
**21.30, 5.05** «Гібель імперыі». Серыял.
**22.40** «Абрабаванне па-французску». Маст. фільм.
**1.15** «Хадзячыя мерцвякі». Серыял.

## ТБ1000

**5.00** Камедыя «У Міні гэта ў першы раз».
**7.00** Драма «Зрабі крок».
**9.00** Камедыя «Калі свякроў — монстр».
**11.00** Камедыя «Ходзяць чуткі...».
**13.00** Драма «Баец».
**15.20** Баявік «Прывідны гоншчык 2».
**17.05** Меладрама «Вяселле майго лепшага сябра».
**19.00** Камедыя «Як па масле».
**20.40** Камедыя «Нязносны Генры».
**22.25** Драма «Олівер Твіст».
**0.45** Драма «Небяспечны метад».
**2.45** Фільм жахаў «Страшыдлы».

## ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Казка «Варвара краса — доўгая каса».
**7.40** Камедыя «Іронія лёсу. Працяг».
**9.50** Казка «Рыжык у Залюстаркоўі».
**12.00** Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана».
**14.00** Камедыя «Наша Russia. Яйкі лёсу».
**16.00** Фэнтэзі «Казка. Ёсць».
**18.00** Камедыя «Нявеста любой цаной».
**20.00** Драма «Мелодыя для катрынкі».
**22.40** Трагікамедыя «Два ў адным».
**0.55** Драма «Лісты да Эльзы».
**3.00** Камедыя «Назад — да шчасця, або Хто знойдзе Сінюю птушку».
**4.55** Меладрама «Перцы».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 21.00, 1.00, 4.00** Машыны.
**6.00** Супердрапежнікі.
**7.00** Злавіць сома.
**8.00, 13.00** Гульні розуму.
**9.00, 14.00** Займальная навука.
**10.00** Аўта-SOS.
**11.00** Страчаныя скарбы Амерыкі.
**12.00** Золата горада-прывіда.
**15.00** Дзікая прырода Расіі.
**16.00** Гісторыя жывёльнага свету.
**17.00, 2.00** Вялікія ўцёкі.
**18.00** Скарбашукальнікі.
**19.00, 0.00, 3.00** Прыроджаны байкер.
**22.00** Дзікі тунец.
**23.00** Расследаванні авіякатастроф.

## DISCOVERY

**7.00, 16.00** Пятая перадача.
**7.50, 12.20, 22.00** Выжыць разам.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35** Багажныя войны.
**10.30, 0.55** Top Gear.
**11.25** Адваротны бок хаосу.
**13.15, 16.25, 6.05** Махінатары.
**14.10, 3.55** Аўтальянцы.
**15.05** Правілы пазадарожнага руху.
**17.20, 3.05** Паляўнічыя на склады.
**18.15** Акулы аўтатаргоў з Даласа.
**19.10** Хуткія і гучныя.
**21.00** Бітвы за кантэйнеры.
**22.00** Паляўнічыя на склады.
**23.00** Ліквідатар.
**0.00, 5.10** Пяцёрка лепшых.
**1.50** Сапраўдныя аферысты.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

# ЧАЦВЕР, 20 САКАВІКА

## БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.35** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.15** Зона X.
**9.10, 15.25 Серыял «Дыхай са мной».**
**11.00, 20.00 Серыял «Ластаўчына гняздо».**
**11.55** «Славянскі кірмаш у Віцебску-2014». Нацыянальны адбор.
**12.10, 1.05** Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
**13.10, 21.45 Серыял «Фурцава».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.30** Беларуская часінка.
**19.20, 23.55** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**0.50** Дзень спорту.

## БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 18.55** Тэлебарометр.
**9.05, 16.25 Серыял «Цені мінулага».**
**10.10, 1.00 Серыял «Людзі Шпака».**
**11.20, 19.00 Дэтэктыў «Гульня на выбыванне».**
**13.15 Серыял «Універ. Новы інтэрнат».**
**14.25** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны.
**15.50** Аўтабатл.
**17.25** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны.
**20.55, 23.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/8 фіналу.
**21.50** «КЕНО.

## БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабранарак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.10, 14.55, 17.00, 21.05, 0.00** «Калейдаскоп».
**8.05, 12.20, 15.05, 17.05, 0.05** «Энцыклапедыя беларускага спорту». Валейбол.
**8.15, 20.00 Серыял «Залатое цяля».**
**9.00, 21.50** «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
**9.30, 21.10 Серыял «Мегрэ».**
**10.25, 23.35** «Святло далёкай зоркі». Памяці рэжысёра Віктара Шавялевіча.
**10.50, 14.25, 16.25, 19.50** «Размаўляем па-беларуску».
**10.55 «Нашы суседзі». Маст. фільм.**
**12.30** «Карані». Барыс Казлоўскі і яго вясковы музей.
**12.55** «На прыродзе з Віталем Гуменным». Выганашчанскія балоты.
**13.10** «Скарбніца Віцебшчыны». Маёнтак роду Лапацінскіх.
**13.40** «Палескі пачастунак». Салёнае сала.
**13.55 «Збянтэжаны Саўка». Маст. фільм.**
**14.30** «Лабірынты». «Над дняпроўскай стромай». Жыццё і творчасць Янкі Купалы.
**15.15** «Васіль Корж. Урокі жыцця». Дак. фільм.
**15.45** «Музеум». Урэцка-Налібоцкае шкло.
**16.00** «Цуды прыроды». Патагонія, Венгрыя. Беліз. Новая Зеландыя.
**16.35** «Партрэт на фоне сябе». Творчасць мастака Уладзіміра Цэслера.
**17.15** «Гісторыя аднаго горада». Дак. фільм.
**17.45** «Сямейны альбом». Жыццё і творчасць кінарэжысёра Міхаіла Пташука.
**18.00** «Падарожжа са смакам». Тайланд.
**18.30** «Наша спадчына». Пінскія святыні.
**19.00** «Сёмае неба Паўла Масленікава». Дак. фільм.
**19.25** «Камертон». Гітарыст, народны артыст Расіі Аляксей Кузняцоў.
**20.45** Калыханка.
**22.20 «Навучыся танцаваць». Маст. фільм.**

## БЕЛАРУСЬ 5

**8.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд.
**8.35** Тэніс. Турнір ВТА. Маямі.
**10.35** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. 1/2 фіналу. «Металург» (Жлобін) — «Нёман» (Гродна).
**12.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Барусія Дортмунд» (Германія) — «Зеніт» (Расія).
**14.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Манчэстэр Юнайтэд» (Англія) — «Алімпіякас» (Грэцыя).
**15.55** Алімпійскія гульні. Сочы-2014. Фрыстайл. Слоупстайл. Фінал. Мужчыны.
**17.05** Біятлон. Кубак свету. Осла. Спрынт. Жанчыны.
**18.30** Хакей. КХЛ. Плэй-оф.
**20.55, 23.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ.

## АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «У наш час».
**12.05** «Яны і мы».
**13.10** «Добрага здаровейка!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15** «Зразумець. Дараваць».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Смешнае і яшчэ смяшнейшае».
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Дрэнная кроў».**
**23.20 Маст. фільм «Аса».**
**2.00** Начныя навіны.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**9.00, 18.30** «Вам і не снілася»: «Тайна нараджэння».
**10.05** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35 «Вовачка 3». Серыял.**
**12.05** «Сямейныя драмы».
**13.00** «Прыгоды дылетанта».
**13.50 Меладрама «Даруй за каханне».**
**15.55** «Глядзець усім!».
**16.50** «Следакі».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Фантастыка «Вавілон 5: легенда пра рэйнджараў: жыць і памерці ў ззянні зорак».**
**22.00** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**23.00** «Тайны свету».
**23.55** «Аўтапанарама».
**0.15 Маст. фільм «Сунічная паляна».**

## МІР

**5.00** «180 хвілін».
**8.15, 18.20 Серыял «Маўклівы сведка».**
**10.00, 0.25 Маст. фільм «Інспектар ДАІ».**
**11.30** «Дыяспары».
**12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**12.20 Серыял «Чужыя памылкі».**
**14.05** Дак. фільм «У свеце цудаў».
**15.20, 23.35** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.10, 3.25 Серыял «Монтэкрыста».**
**21.20 Серыял «Пастка».**
**23.05, 4.25** «Злачынства і пакаранне».
**1.50 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Асаблівы выпадак».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Прамы эфір».
**12.45 Серыял «Чужы твар».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.40** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Малога. Горад асуджаны».
**15.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**17.10 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**18.05 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».**
**18.55 Серыял «Блудныя дзеці».**
**20.45 Серыял «Ластаўчына гняздо».**
**21.45 Серыял «Там, дзе ты».**
**23.50 Серыял «Тайны следства».**
**0.40** «Лёгкае дыханне Івана Буніна».

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.15** «Справа густу».
**15.40, 18.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.35, 23.35 Серыял «Марскія д'яблы».**
**23.10** Сёння. Вынікі.

## 8 КАНАЛ

**7.00, 12.30, 19.05, 20.55, 23.45** «Надвор'е».
**7.05, 16.05** «Мультпарад».
**7.30 Баявік «Доктар Но».**
**9.25, 17.55 Серыял «Служба навін».**
**10.30** «Неверагодная магія».
**11.00, 19.10 Серыял «Тайныя сувязі».**
**12.35 Меладрама «Еш, маліся, кахай».**
**14.55** «Кінаблакнот».
**15.10 Серыял «Тайны Ніра Вульфа».**
**16.30** «VR-дайджэст».
**17.00 Серыял «Тэорыя хлусні».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.10 Драма «Валянцінка».**
**23.15** Ток-шоу «Бульбокс».

## ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 18.15, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 19.00 Серыял «Святлафор».**
**10.00** «Гардэроб на вылет».
**11.00** «Жонкі алігархаў».
**12.00, 20.00 Серыял «Кухня».**
**13.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**14.00, 23.20** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**16.00 Прыгоды «Зыходнае становішча».**
**18.30, 0.00** «Лаві момант».
**21.10 Баявік «Ямакасі. Або новыя самураі».**

## КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00, 14.00, 18.00, 22.30** Навіны культуры.
**9.15, 0.55** «Наглядальнік».
**10.15 «Пэры Мэйсан». Серыял.**
**11.10, 19.10** «Правілы жыцця».
**11.40** «Правінцыйныя музеі». «Па родных мясцінах Міхаіла Прышвіна».
**12.10** «Метэарытная пагроза». Дак. фільм.
**13.00** «Каміль Каро». Дак. фільм.
**13.10 «У лясах і на гарах». Серыял.**
**14.10, 22.50 «Віз». Маст. фільм.**
**16.20** Майстры фартэпіяннага мастацтва.
**17.05** «Стэндаль». Дак. фільм.
**17.10** Academia.
**18.15** Галоўная роля.
**18.30** Да 80-годдзя Людвіга Фадзеева. «Астравы».
**19.10** «Правілы жыцця».
**19.40** «Хто мы?».
**20.05** «Сусветныя скарбы культуры».
**20.20** «Культурная рэвалюцыя».
**21.05** Прыступкі цывілізацыі. «Вочы пустыні Атакама». Дак. фільм.
**22.00** «Сялянская гісторыя». Дак. серыял.

## НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Спяем, сябры!». 2005 год.
**6.05** «Знак пытання». 1994 год.
**6.30, 0.30** «Усё пра Еву». Фільм-спектакль. 1990 год.
**7.45** «Добрай ночы, малыя». «Як я перастаў хлусіць». 1990 год.
**8.00, 14.00, 20.00, 2.00** «Мінулы час» .
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Народжаныя ў СССР».
**10.00, 4.00** «Салют, фестываль!». Тэлемост Масква — Гавана. 1985 год.
**11.00** «Усур'ёз і надоўга». Дак. фільм.
**12.00** «Бліц». 1990 год.
**12.35, 18.35 «Дні хірурга Мішкіна». Маст. фільм.**
**16.00, 22.00** «Дзесяць цяжкіх дарог... Дзесяць гадоў на сцэне». 1992 год.
**17.00** «Дванаццаты паверх». 1986 год.
**19.45** «Сядзі і глядзі». 1994 год.
**23.00** «... Да 16 і старэйшым». 1991 год.
**23.45** Канцэрт замежнай эстрады.
**0.05** «Старты для ўсіх». Дак. фільм.

## EUROSPORT

**10.30, 19.00** Футбол. Кубак свету (U-17).
**11.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Чэмпіянат свету FIS па палётах на лыжах.
**12.45, 16.00, 21.00, 1.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**14.00, 17.00, 22.00, 2.30** Біятлон. Кубак свету.
**15.45** Зімнія віды спорту. Скі-пас.
**23.45** Байцоўскі клуб.
**3.15** All sports.

## КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 8.00, 13.05, 16.00, 2.20** Серыял «Камп'ютаршчыкі».
**6.00, 10.35, 15.45, 16.45, 20.45, 23.50, 1.50, 3.10** «Камедыянты. Лепшае».
**6.15** Камедыя «Мадам Ірма».
**9.00** Камедыя «Мамчын сынок».
**11.15** Камедыя «Паміж анёлам і чортам».
**14.10** Камедыя «Цёрнер і Хуч».
**17.20** Камедыя «Кватарант».
**19.20** Камедыя «Гэта нявызначанае пачуццё».
**21.00** Серыял «Прападобны». 1-я серыя.
**22.10** Фэнтэзі «Два светы».
**0.10** Камедыя «Аперацыя «Святы Януарый».
**3.25** Камедыя «Ажанюся з першай сустрэчнай».

## ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.15, 14.45, 2.30** «Доктар І..».
**8.45, 18.30, 3.15** «Забароненае каханне». Тэлесерыял.
**10.30, 17.00** «Паралельны свет». Дак. серыял.
**11.30, 16.00** «Варажбітка». Дак. серыял.
**12.30, 18.00** «Паляўнічыя на прывідаў». Дак. серыял.
**13.00, 20.20** «Леднікаў». Серыял.
**13.50, 1.40** «Дом дагары нагамі».
**15.15, 0.15, 5.20** «Звышнатуральнае». Серыял.
**21.20, 4.30** «Гібель імперыі». Серыял.
**22.30** «Гульня смерці». Маст. фільм.
**1.00** «Хадзячыя мерцвякі». Серыял.

## ТБ1000

**5.00** Камедыя «Ходзяць чуткі...».
**6.40** Трылер «Ракавы лік 23».
**8.20** Меладрама «Вяселле майго лепшага сябра».
**10.15** М/ф «Дом-монстр».
**11.55** М/ф «Рабі ногі».
**13.50** Камедыя «Нязносны Генры».
**15.35** Трылер «Глыбокае сіняе мора».
**17.20** Камедыя «Як па масле».
**19.00** Драма «Касмаполіс».
**21.00** Камедыя «Пастка для нявесты».
**22.35** Драма «Небяспечны метад».
**0.15** Фільм жахаў «Выбар кілера».
**1.40** Камедыя «З вачэй — прэч, з чарта — вон!».
**3.20** Драма «Тайны знак».

## ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.45** Камедыя «Спартакіяда. Лакальнае пацяпленне».
**8.30** М/ф «Ілья Мурамец і Салавей Разбойнік».
**10.00** Камедыя «Нявеста любой цаной».
**12.00** Дэтэктыў «Смерць пад ветразем».
**13.50** Трагікамедыя «Два ў адным».
**16.10** Меладрама «Перцы».
**18.00** Драма «Залатое стагоддзе».
**20.00** Драма «Агні прытона».
**22.00** Меладрама «Будзь са мной».
**23.30** Камедыя «Шчаслівы канец».
**1.30** Драма «Жонка генерала».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 21.00, 1.00, 4.00** Махляры Амерыкі.
**6.00** Супердрапежнікі.
**7.00** Злавіць сома.
**8.00, 13.00, 19.00** Прыроджаны байкер.
**9.00, 14.00** Машыны.
**10.00** Аўта-SOS.
**11.00** Страчаныя скарбы Амерыкі.
**12.00** Цяжкае золата Аляскі.
**15.00** Дзікая прырода Расіі.
**16.00** Прыручыць дракона.
**17.00, 2.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**18.00** Скарбашукальнікі.
**20.00, 0.00, 3.00** Аферысты і турысты.
**22.00** Дзікі тунец.
**23.00** Расследаванні авіякатастроф.

## DISCOVERY

**7.00** Аўтальянцы.
**7.50, 12.20, 22.00** Правілы пазадарожнага руху.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35, 19.10** Паляўнічыя на склады.
**10.30, 0.55** Top Gear.
**11.25** Пяцёрка лепшых.
**13.15** Махінатары.
**14.10, 3.55** У пагоні за класікай.
**15.05** Хлопцы з Юкана.
**16.00** Пятая перадача.
**16.25, 6.05** Махінатары вяртаюцца.
**17.20, 3.05** Адпетыя рыэлтары.
**18.15** Бітвы за кантэйнеры.
**21.00** Залатая ліхаманка.
**23.00** Кландайк.
**0.00, 5.10** Як уладкаваны Сусвет.
**1.50** Сапраўдныя аферысты.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

# НЕ ПОЛЕ ПЕРАЙСЦІ

## САКРЭТ ДАЎГАЛЕЦЦЯ БАБУЛІ КАЦІ

**Кацярыне Якаўлеўне Курусавай, жыхарцы Гарадоцкага раёна, на днях споўнілася 100 гадоў! Цікава, што да Вялікай Айчыннай вайны яна працавала паштальёнам. Значыць, разносіла разам з іншымі газетамі і «Звязду». Што дзіўна, у сваім вельмі паважаным узросце бабуля працуе на агародзе, ходзіць у лазню і можа, як кажуць, падтрымаць кампанію падчас сямейных застолляў.**



Але, на жаль, яна вельмі дрэнна чуе. Таму мне пра яе расказаў 58-гадовы сын Уладзімір Дзмітрыевіч Курусаў. Мужчына, які працуе механікам у гаспадарцы, апошнія некалькі гадоў жыве з мамай. Вядома, даглядае і нават уколы ёй робіць.

— Мы жывём у вёсцы, за 20 кіламетраў ад райцэнтра. Маме маёй 5 сакавіка споўнілася 100 гадоў. Так, яна нарадзілася ў Гарадоцкім раёне. Але той вёскі ўжо, на жаль, даўно няма. Я каля 5 гадоў жыву разам з ёю. Не хацела мама, каб да сябе ў дом «забраў», таму сам пераехаў да яе. Акрамя мяне, у мамы было яшчэ двое дзяцей. Старэйшы брат памёр, а сярэдні жыве ў Санкт-Пецярбургу.

Паводле слоў Уладзіміра Дзмітрыевіча, Кацярына Якаўлеўна скончыла толькі чатыры класы, працавала да вайны паштальёнам. Пасля Вялікай Айчыннай вайны дэмабілізавалі яе ў Германію, каб жывёлу, канфіскаваную ў немцаў, гнала праз Германію і Польшчу ў Беларусь...

Добра памятае Кацярына Якаўлеўна і як пачыналася калектывізацыя, і голад 1930-х гадоў. У 1933 годзе хлеба на стале вяскоўцаў не было.

Вядома ж, аўтар гэтых радкоў паспрабаваў больш дэталёва запытаць аб здароўі, сакрэце даўгалецця бабулі.

Высветлілася, што бачыць яна і цяпер добра. Яшчэ мінулым летам у агародзе лёгкую працу выконвала: градкі капала, праполвала, палівала. Працаваць на зямлі для яе — задавальненне. Раней бабуля трымала кароў, свіней. А цяпер у хатняй гаспадарцы толькі куры.

— Сакрэт даўгалецця ў чым? Просты ён: аптымізм і ўмеранасць у харчаванні! Ніколі шмат не ела, пераборлівая ў ежы... Шкодных звычак не было ніколі. Калі чарачку гарэлкі вып'ем разам — і ўсё... Не курыла, мужу верная была. А вось асноўны «сакрэт», — аптыміст яна! Хоць наглядзелася ў вайну многага... Здароўе ў яе моцнае. Толькі ад ціску лекі прымае. Бывае, суставы забаляць, дык укол зраблю, і лягчэй ёй становіцца. І ўрач, вядома ж, да нас наведваецца. Мама вельмі дрэнна ходзіць — метраў 100, не больш. Сэрца пры гэтым здаровае, аперацый ніколі ёй не рабілі. Ходзіць у лазню. У нас жа свой дом, дык як без лазні? Ды маму хоць у самалёт пасадзі, вытрымае, — смяецца сын юбіляркі.

Хочацца шчыра пажадаць Кацярыне Якаўлеўне яшчэ шмат гадоў. Упэўнены, што так яно і будзе!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота Ганны НАВУМАВАЙ.**
*Гарадоцкі раён.*

■ Жаночае здароўе

# НЯМА ВІРУСА — НЯМА РАКУ

**Рак шыйкі маткі — адзіны від раку, які можна дзейсна прафілактаваць. (Астатнія віды, як вядома, — толькі кантраляваць, або адсоўваць час іх надыходу.) Адносна раку шыйкі маткі вядома, што яго выклікае вірус папіломы чалавека. Вакцына, якая абараняе ад інфіцыравання гэтым вірусам, сёння актыўна выкарыстоўваецца ўсё большай колькасцю краін. Прышчэпкі ад віруса папіломы чалавека можна зрабіць на платнай аснове ў дзяржаўных і камерцыйных медустановах Беларусі.**

### Пра вакцыну

— Аптымальны эфект ад выкарыстання вакцыны супраць віруса папіломы чалавека дасягаецца, калі правесці вакцынацыю за паўтара года да першага сексуальнага кантакту, — кажа **галоўны пазаштатны дзіцячы гінеколаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Аксана КУДЗІНА.** — Аднак падлеткі не могуць такім чынам спланаваць сваё жыццё. Таму аптымальным узростам для падобнай вакцынацыі лічыцца 10-12-гадовы ўзрост. Прышчэпка робіцца тройчы. Бацькі, якія жадаюць абараніць сваіх дачок, могуць звяртацца па кансультацыю да ўрачоў-гінеколагаў. Сёння ўсе гэтыя спецыялісты добра інфармаваны адносна такой вакцынацыі. На мой погляд, гэта той «гаджэт» у медыцыне, ад якога не трэба адмаўляцца...

Вакцыны (у нашай краіне выкарыстоўваецца два віды прышчэпак) лічацца эфектыўнымі ў сэнсе прафілактыкі і для ўжо інфіцыраваных, паколькі дапамагаюць вірусу хутчэй пакінуць арганізм, а пры паўторнай «сустрэчы» перашкаджаюць яму прыжыцца.

Паколькі было ўстаноўлена, што вірус папіломы чалавека выклікае не толькі рак шыйкі маткі, але і рак кішэчніка, органаў галавы і шыі, то ў шэрагу краін рэкамендуюць вакцынаваць і хлопчыкаў. У цэлым жа мяркуецца, што дзякуючы татальнай вакцынацыі дзяўчынак удасца спыніць цыркуляцыю віруса папіломы чалавека ў папуляцыі.

### Аб'ектыўная сітуацыя

У шэрагу краін, у тым ліку і ў нашай, назіраецца рост гінекалагічнай анкалагічнай захваральнасці. Больш фіксуецца выпадкаў раку цела маткі, шыйкі маткі, яечнікаў, похвы. У апошні час адзначаецца найбольш значны рост раку яечнікаў і шыйкі маткі. Прычым у шэрагу еўрапейскіх краін колькасць выпадкаў раку шыйкі маткі зніжаецца, а ў недалёкай будучыні гэтыя краіны намераны наогул забыцца на такі від раку. Кожныя два дні ў Беларусі пяці новым жанчынам выстаўляецца дыягназ раку шыйкі маткі. Ад яго ж у сярэднім адна жанчына ў дзень гіне.

Калі рак шыйкі маткі выяўляецца на першай стадыі, то выконваюцца органазахавальныя аперацыі — выдаляецца толькі шыйка з лімфатычнымі вузламі. Шанцы, што жанчына будзе здаровай пасля гэтага лячэння, досыць высокія. На 2-й стадыі гэты від раку можа распаўсюджвацца на навакольныя тканкі, што патрабуе прамянёвага лячэння або хіміятэрапіі.

У Беларусі сёння на 1-2-й стадыях выяўляецца каля 60 працэнтаў выпадкаў гінекалагічнага раку. Выяўленне таго ж раку шыйкі маткі на 3-4-й стадыях — у прынцыпе, нонсэнс. У жанчыны з такой позняй стадыяй захворвання мазкі, калі разабрацца, на працягу дзесяці гадоў павінны былі ўказваць на захворванне. Узнікаюць пытанні: ці хадзіла пацыентка да ўрача? Ці якасна быў узяты матэрыял для даследавання? Ці якасна апрацаваны і даследаваны? Ці не прапусціў змены цытолаг? На жаль, дакладных адказаў на гэтыя пытанні сёння няма. Іх здольны даць толькі скрынінг — абследаванне патэнцыйна здаровых жанчын, якія будуць нават без наяўнасці скаргаў рэгулярна (раз ці два на год) абследавацца ў гінеколага.

### Неспрыяльныя ўмовы

— Вірус папіломы чалавека вядомы вельмі даўно, аднак не так даўно стала вядома, што некаторыя тыпы гэтага віруса выклікаюць рак шыйкі маткі, — тлумачыць **дацэнт кафедры акушэрства, гінекалогіі і рэпрадуктыўнага здароўя БелМАПА, кандыдат медыцынскіх навук Дзмітрый БУР'ЯК.** — Распаўсюджанасць гэтага віруснага захворвання значна вышэй, чым распаўсюджанасць раку. 25-30 працэнтаў жанчын маладога рэпрадуктыўнага ўзросту інфіцыраваны, паколькі вірус даволі лёгка перадаецца палавым або кантактным шляхам. Вірус папіломы чалавека вылучаецца нават у дзяўчынак, якія не жылі палавым жыццём: яны атрымалі яго ад маці (пры родах, падчас груднога кармлення і інш.). Анкагенныя тыпы перадаюцца, галоўным чынам, палавым шляхам. Трэба разумець, што без віруса няма раку, аднак не ва ўсіх інфіцыраваных развіваецца рак. Свой адмоўны ўплыў аказваюць і іншыя фактары: ранні пачатак палавога жыцця, вялікая колькасць палавых партнёраў, спадчыннасць, наяўнасць віруснай герпеснай або мікробнай гінекалагічнай інфекцыі. Запусціць працэс развіцця перадраку можа цяжарнасць, гарманальная перабудова, аслабленне імунітэту, а таму ў групе рызыкі жанчыны пасля 40-45 гадоў.

### Да гінеколага — рэгулярна

У сярэднім на развіццё раку з моманту інфіцыравання патрабуецца 10-20 гадоў, хоць у нашай краіне зафіксаваны выпадак смерці ад раку шыйкі маткі ў 15-гадовай дзяўчыны. Наяўнасць віруса ў арганізме можна ніяк не адчуваць. Да таго ж у 80 працэнтах выпадкаў спрацоўвае імунітэт і вірус выдаляецца з арганізма. Праўда, няма гарантый, што праз нейкі час жанчына не будзе інфіцыравана зноў. Самае важнае, што кожная жанчына павінна рабіць для сябе, — раз на год наведваць гінеколага.

— Сам факт наяўнасці віруса папіломы чалавека ў шыйцы маткі адносіць жанчыну да групы рызыкі, — кажа **кіраўнік онкагінекалагічнай групы РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава, кандыдат медыцынскіх навук Сяргей МАЎРЫЧАЎ.** — Для абследавання нашых жанчын прымяняецца ПАП-тэст (спецыяльнае цыталагічнае даследаванне для выяўлення раку шыйкі маткі). Гэтае даследаванне дазваляе выявіць змены, якія пакідае вірус папіломы чалавека. Яго працяглае знаходжанне ў клетках паступова прыводзіць да дысплазіі, якая, у сваю чаргу, прыводзіць да раку in sity (першаснае праяўленне). Таму важна выявіць змены ў шыйцы, пралячыць іх і тым самым прафілактаваць рак.

### Як ажыццяўляецца скрынінг?

Калі вакцынацыя — пярвічная прафілактыка, то другасная — менавіта скрынінг. Лічыцца, што ў 4 з 5 жанчын з дапамогай скрынінгавых тэхналогій можна папярэдзіць рак шыйкі маткі. Яны грунтуюцца на прымяненні ВПЧ-дыягностыкі, калі мазок даследуецца метадам палімеразна-ланцуговай рэакцыі. Гэта дазваляе выявіць і сам вірус, і яго колькасць. Сёння такая дыягностыка выконваецца на бясплатнай аснове толькі цяжарным жанчынам.

Класічны варыянт айчыннага скрынінгу, які ажыццяўляецца сярод невялікіх груп жаночага насельніцтва, выглядае наступным чынам. Група жанчын ва ўзросце 25-30 гадоў праходзіць ПАП-тэст. Пры адсутнасці змен жанчынам рэкамендуецца прайсці тэст праз 3 або 5 гадоў. Пры нармальнай цыталогіі верагоднасць развіцця раку ў такі прамежак часу мінімальная. Калі ж выяўляюцца нейкія змены, прызначаецца даабследаванне (кальпаскапія, біяпсія) і далейшае лячэнне.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

# ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА*

### ЗАЎЗЯТЫ АМАТАР



У шашках ім з'яўляецца Анатоль Антонавіч Пярхальскі *(на фота)* — старшыня ветэранскай арганізацыі глыбоцкага ААТ «АТП-16». Калі прайшоў турнір, «Веснік Глыбоччыны» пісаў: «У ім прымалі заўзятыя аматары ва ўзросце 60+. Асабліва радасна за пераможцу: Анатоль Антонавіч многа зрабіў і робіць у нашым раёне для папулярызацыі старадаўняй гульні. Без увагі мясцовай газеты не застаўся і факт выпуску ім зборніка «Шашачныя партыі»: «Гульцы і трэнеры-выкладчыкі знойдуць у згаданай кніжачцы павучальны матэрыял, які стане яшчэ адной прыступкай павышэння зацікаўленасці дзяцей і дарослых шашачным мастацтвам».

А.А. Пярхальскі ўдзельнічаў у завочных спаборніцтвах і выканаў норму кандыдата ў майстры спорту. Пазнаёмцеся з фрагментам яго партыі:

**Белыя** (А. Пярхальскі): a3, c1, c3, c5, d2, d4, f2, g1 (8). **Чорныя** (В. Кавашэвіч): a5, a7, b6, b8, d8, f8, h6, h8 (8). Вышэйшая ліга чэмпіянату Беларусі па перапісцы (БВЛ-47): 1. fg3 hg7 2. gf4 gf6 3. de3 fe7 4. gf2. Тут Васіль Кавашэвіч (Брэст), які стаў чэмпіёнам па класічнай версіі гульні, вырашыў правесці камбінацыйны ўдар 4... hg5 5. f:h6 fe5 6. d:f6 e:g5 7. h:f4 b:b2, але 8. ab4 9. c:a3 ab6. Пагадзіліся на нічыю.

### АЎТАРСКІ-19

Чэмпіён краіны, нацыянальны майстар спорту Дзмітрый Камчыцкі (Магілёў) працягвае свой конкурс чарговымі заданнямі. У іх белыя пачынаюць і выйграюць:



№ 19/19. **Белыя:** a7, d6, e7, f4, f6, g3, h4 (7). **Чорныя:** b2, b4, b6, c5, d2, f8, h6 (7).



№ 19/20. **Белыя:** b6, c5, d4, d6, e5, f2, f4, h4 (8). **Чорныя:** a7, b2, b8, d2, e7, f6, f8, g7 (8).

№ 19/21 (двайная праблема). **Белыя:** a5, c1, c3, c5, d2, d4, h2, h6 (8). **Чорныя:** a3, b4, c7, d6, e7, f4, f8, g3, g5, h8 (10).

Адказы цягам двух тыдняў накіроўвайце на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, газета «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

### РАШЭННІ

**«Аўтарскі-17»** (П. Шклудаў): **№ 17/21 —** g7, fe3, d4, g1!, f2, f2+ і № **17/22 —** f8, h6, b4, g7 (e1) h8 (g3) f2, c3, c3+.

Даты | Падзеі | Людзі

**1499** год — 515 гадоў таму Мінску прадастаўлена самакіраванне паводле магдэбургскага права. Быў створаны магістрат з 12 чалавек (у тым ліку двух бурмістраў), які ажыццяўляў судовыя і паліцэйскія функцыі, кантраляваў гандаль, збор падаткаў, саслоўныя правы гараджан і г.д.

**1953** год — Мікіта Хрушчоў дамогся падзелу партыйнай і дзяржаўнай улады: Георгій Малянкоў з лёгкасцю пакінуў пасаду сакратара ЦК, захаваўшы за сабой пасаду кіраўніка ўрада. Кіраваць Сакратарыятам ЦК КПСС стаў Хрушчоў. Тое, што адбылося, можна лічыць памылкай Малянкова і Берыі, якія палічылі больш важным захаванне кантролю над дзяржаўнай уладай. Вядома, Сталін на пасадзе старшыні Савета Міністраў быў усеўладным гаспадаром, але такім ён быў бы і без гэтай пасады, з'яўляючыся пасля XIX з'езда «звычайным» сакратаром ЦК партыі.



**1939** год — 75 гадоў таму нарадзіўся Віктар Канстанцінавіч Ганчароў, беларускі вучоны ў галіне лазернай фізікі, доктар фізіка-матэматычных навук (1994), прафесар (2006). З 1965 года працуе ў Інстытуце фізікі АН Беларусі, з 1979-га — загадчык лабараторыі НДІ прыкладных фізічных праблем БДУ. Аўтар навуковых прац па фізіцы плазмадынамічных працэсаў пры лазерна-плазменным уздзеянні на металы і кампазіцыйныя матэрыялы. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1992).

Было сказана

**Рыгор БАРАДУЛІН, народны паэт Беларусі:**
*«Дарога расце ўсё жыццё».*




**Яны здольныя зразумець сябе толькі праз адносіны да іншых. Яны гатовыя з лёгкасцю павярнуцца на 180°, калі іх пункт гледжання хоць у чым-небудзь не задавальняе навакольных. Пры гэтым яны не любяць заставацца незалежнымі, не кідаюцца бяздумна ў які-небудзь калектыў, маюць пачуццё гумару, не баяцца выказваць свае думкі. У асабістым жыцці імкнуцца быць адкрытымі і цярплівымі, з любімага чалавека робяць куміра, лічаць яго ўнікальнай асобай, са сваімі думкамі і пачуццямі. Іх сімвал — упэўненасць, якая засцерагае ад эгаізму, стрымлівае запал і дапамагае вызначыць прынцыпы, ад якіх не след адмаўляцца ці адступаць.**

■ Разам з прыродай

# Жыццё ўперад рухаюць дапытлівыя



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Школьнікі са Светлагорска Арцём ТАКАЧОЎ і Аляксандр ЯРОШЧАНКА абараняюць свой экалагічны праект.

**XXV рэспубліканскі конкурс навуковых біёлага-экалагічных работ сярод вучнёўскай моладзі даказаў існаванне ў нашай краіне сапраўднай школы падрыхтоўкі будучых навукоўцаў. Да таго ж біёлага-экалагічныя веды становяцца пэўнай часткай культуры грамадства**

### ВЕДЫ СУПРАЦЬ ЭКАЛАГІЧНЫХ ВЫКЛІКАЎ

...Дзіўны свет прыроды прывáблівае чалавека з маленства. Кожнаму хочацца паспрабаваць сябе ў ролі эксперыментатара — такі спакуслівы гэты смак пазнання навакольнага свету. Калі атрыманыя веды ўзбагачаюць аднаго чалавека, то навуковыя адкрыцці могуць перайначыць жыццё ўсяго чалавецтва. Чаму і беларусам не быць сярод праслаўленых навукоўцаў свету, дасягнуўшых за кошт сваіх адкрыццяў паляпшэння якасці жыцця на планеце?

Актуальнасць пытання мае і другі бок. Усеагульная біялагічная неграматнасць значнай колькасці насельніцтва планеты, а таксама спецыялістаў, ад якіх залежыць прыняцце рашэнняў у розных галінах, вядзе да пагрозы глабальнага антрапагеннага крызісу.

Плён ад намаганняў, прыкладзеных на распаўсюджванне інавацыйнай адукацыйнай тэхналогіі ў падтрымку юных аматараў прыроды ў Беларусі, аказаўся рознабаковым, і цяжка вызначыць, што з ажыццёўленага мае найбольш каштоўныя вынікі. За апошнія гады вучнямі падрыхтавана і заслухана на высокім узроўні вучоных-прафесіяналаў больш за 1000 дакладаў і навукова-даследчых праектаў. 12 педагогаў і 506 вучняў узнагароджаны прэміяй Фонду Прэзідэнта па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.

У скарбонцы лепшых юных біёлагаў-эколагаў краіны — 45 медалёў, прывезеных з міжнародных конкурсаў. Сваім поспехам навукоўцы-пачаткоўцы заявілі ў розных краінах свету аб багатым інтэлектуальным патэнцыяле Беларусі. Многія з удзельнікаў конкурсу звязалі свой далейшы лёс з навуковай, грамадскай экалагічнай дзейнасцю. Напрыклад, Алег Давыдзенка стаў адным з вядучых вучоных нашай краіны ў галіне генетыкі раслін і чалавека. Пад яго кіраўніцтвам працуе вялікі калектыў лабараторыі храмасомнай спадчыннасці Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі. Многія з яго выхаванцаў атрымалі навуковыя ступені, сталі прызнанымі вучонымі, працуюць побач з настаўнікам у створанай ім лабараторыі.

Рэспубліканскі, а тым больш міжнародны конкурс, — гэта вяршыня, на якую трапляюць найбольш дасціпныя і мэтанакіраваныя ў сваім пошуку вынаходнікі. Для таго, каб узысці на яе, трэба прайсці раённы, абласны этапы конкурсу. А першая і, напэўна, найбольш важная прыступка да прызнання будучых заслуг — гэта схільнасць на ўроку да біялагічных ведаў, жаданне спазнаць існасць законаў навакольнага свету, быць перакананым у тым, што чалавек прыродныя багацці можа спажываць сабе на карысць, аднак ні ў якім разе не мае права наносіць прыродзе шкоду.

Можна з поўнай упэўненасцю гаварыць, што конкурс мае надзвычай шырокае кола ўдзельнікаў, кожны з якіх атрымлівае бясспрэчную перамогу — папаўняе рады адукаваных людзей.

### ПЕРАКОНВАЦЬ У ПЕРАМОЗЕ — ПА-АНГЛІЙСКУ

Да ўдзелу ў сёлетнім рэспубліканскім конкурсе навуковых біёлага-экалагічных работ школьнікаў было прынята 97 праектаў. Як аберагаць прыроду і захоўваць усё жывое на зямлі, канкурсанты адлюстроўвалі ў сваіх дакладах і даказвалі ў шасці навукова-даследчых секцыях.

«Па сутнасці, кожная з работ з'яўляецца грунтоўным навуковым даследаваннем. Асобныя работы носяць прыкладны характар, і ўжо сёння іх можна выкарыстоўваць на практыцы», — такую ацэнку па выніках конкурсу даў старшыня журы кандыдат біялагічных навук, дацэнт Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка Аляксандр Хандогій. Сярод найбольш цікавых ён вызначыў даклады, якія датычыліся даследаванняў птушак, смаўжа вінаградната, вывядзення чыстапародных сярэднееўрапейскіх пчол, выкарыстання аеру балотнага ў лячэбных мэтах.

Пераможцамі сёлетняга юбілейнага конкурсу сталі Дар'я Пашкевіч (Экалагічны цэнтр г. Белаазёрска, вучаніца гімназіі г. Белаазёрска), Ілья Саўчанка (Віцебскі абласны палац дзяцей і моладзі, вучань гімназіі № 1 г. Віцебска), Аляксей Радчанка (вучань 10 класа СШ № 1 г. Крычава), Ксенія Маслак, (Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства, вучаніца 11 класа гімназіі № 56 г. Мінска), Ілья Навасельскі, (Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства, вучань 10 класа гімназіі № 6 г. Мінска), Павел Татур (вучань 10 класа СШ № 3 г. Асіповічы).

На другі дзень конкурсу абарона праектаў вялася на англійскай мове — мове сусветнай навукі. Пераможцы конкурсу ўвойдуць у склад каманды, якая ў бліжэйшы час будзе прадстаўляць Беларусь на міжнародным узроўні.

❍❍❍

***І ўсё ж такі, якія перавагі можа атрымаць чалавецтва ў недалёкай перспектыве ад біялагічнай навукі?***

**Член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар біялагічных навук Алег Давыдзенка вызначае тры кірункі, якія зробяць істотную рэвалюцыю ў развіцці чалавецтва:**

— Гэта стане магчымым дзякуючы бурнаму развіццю малекулярнай генетыкі, малекулярнай біялогіі, біяхіміі.

Ёсць магчымасць вывучаць асабісты геном кожнага чалавека, што прынцыпова важна для медыцыны, якая стане лячыць хворых не агульна, а кожнага асобна. Да гэтага мы ўжо наблізіліся. Наша лабараторыя здольная рабіць дыягностыку, чаму лякарствы адным падыходзяць, а іншым — не. Гэта вельмі важна для развіцця індывідуальнай медыцыны.

Пакуль што не вядома, як чалавек думае, запамінае, захоўвае інфармацыю, як яна перадаецца ад нейрона да нейрона. У цэнтры вывучэння — мозг чалавека. Мая лабараторыя гэтым не займаецца, а ў сусветнай біялогіі вядуцца актыўныя даследаванні. Для гэтых мэт асабліва многа выдзяляецца сродкаў у ЗША, іншых краінах Захаду. Калі ўдасца даследаваць мозг глыбей, адкрыюцца новыя перспектывы ў лячэнні людзей, дапаможа ім у іншых кірунках. Пераносячы ўсё самае лепшае з біялогіі ў свет тэхнікі, можна будзе ствараць разумныя машыны. Для чалавецтва гэта стане каласальным прарывам наперад.

Дасягненні генетыкі здольныя паскорыць і селекцыйны працэс. Дзедаўскія метады адбору, ацэнкі і г.д. (хаця пэўным чынам не абысціся і без іх) замяняюць новыя інструменты, якія дазваляюць хутчэй удасканальваць пароды жывёлы. Генная інжынерыя, малекулярныя маркеры набліжаюць да таго, што мы бачыць не можам. Расліна відавочная знешне: яна высокая або нізкая, але немагчыма ўбачыць, ці ёсць там гены фотаперыядызму, высокага бялка. З дапамогай генетычных інструментаў пачынаем гэта бачыць, з тысячы формаў вызначаць тое, што важна для гібрыда. А з гібрыдаў адразу выбіраць гомазіготы, якія маюць патрэбны набор патрэбных генаў. Гэта не толькі істотна паскарае селекцыйны працэс, але і робіць яго больш эфектыўным.

**Алена СТЭЛЬМАХ**

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 7.28 | 19.11 | 11.43 |
| Віцебск | 7.19 | 19.00 | 11.41 |
| Магілёў | 7.18 | 19.01 | 11.43 |
| Гомель | 7.14 | 18.58 | 11.44 |
| Гродна | 7.43 | 19.27 | 11.44 |
| Брэст | 7.43 | 19.28 | 11.45 |

### Месяц

***Поўня 16 сакавіка.***
***Месяц у сузор'і Дзевы.***

### Імяніны

***Пр.*** *Антаніны, Ганны, Еўдакіі, Надзеі, Аляксандра, Антона, Васіля, Івана, Пятра.*
***К.*** *Евы, Мацільды, Лазара, Лявона, Міхала.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




УСМІХНЕМСЯ

— Фіма, а колькі вам гадоў?
— Трыццаць тры!
— Але ж тры гады таму вы казалі тое ж самае!
— Я не з тых, хто сёння кажа адно, а заўтра — іншае!..

**Звычайна жанчына перастае рабіць пакупкі тады, калі:**
**1. Скончыліся грошы.**
**2. Скончыліся рукі.**

Сустрэліся два дзяды:
— Ну што, Міхалыч, успомнім маладосць? Пойдзем па дзеўках?!
— Пайшлі, Пятровіч. А калі адмовяць?
— Ну, гэта не бяда! Бяда будзе, калі пагодзяцца.




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 22.315. Індэкс 63850. Зак. № 1117.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30
13 сакавіка 2014 года.